ПЕРШАЯ

ЧЫТАНКА

ПАСЬЛЯ ЛЕМАНТАРА

для

Беларускіх Дапаўняльных Школаў.

Улажыла

Валентына Пашкевіч.

Выдавецтва "Беларуская Школа"

– 1968 –

ПЕРШАЯ

ЧЫТАНКА

ПАСЬЛЯ ЛЕМАНТАРА

для

Беларускіх Дапаўняльных Школаў.

Улажыла

Валентына Пашкевіч.

Выдавецтва "Беларуская Школа"

– 1968 –

ЗЬМЕНА

Як ніколі, сяньня
Дзень для нас вясёлы –
Першы дзень гурбою
Мы ідзём у школу!
Будуць з нас пілёты,
Будуць інжынеры –
У жыцьцё адкрыты
Нам шырока дзьверы!
І расьцём, што кветкі
На бязьмежнай ніве,
Мы ў сваёй краіне
Зьменаю шчасьлівай.

І. Шуцько

ЖЫВЫ КУТОК

У нашай школе ёсьць жывы куток.

Там жывуць розныя жывёлы – вожык, белыя мышы, трусікі, яшчарка і вавёрачка.

Ёсьць таксама ў нашым жывым кутку і расьліны. Мы добра даглядаем жывёлы і расьліны.

Слоўнічак:

Жывёлы – animals.
Вожык – porcupine
Трус, трусік – rabbit.
Яшчарка – lizard.
Вавёрка, вавёрачка – squirrel.

ЗАГАДКА

Ног ня маю, а хаджу.
Хоць нямы я, а скажу:
Калі спаць,
Калі ўставаць,
Калі працу пачынаць.

У БІБЛІЯТЭЦЫ

Надзя і Лена прыйшлі ў бібліятэку.

У бібліятэцы шмат кніжак. Вялікія паліцы з кнігамі стаяць каля сьценаў. Некаторыя кнігі ляжаць на сталох. На вокладках – прыгожыя малюнкі. У пакоі цішыня. За сталамі сядзяць дзеці і чытаюць кнігі, часапісы і газэты. На сьценах – партрэты і абразы. Добра ў бібліятэцы. Тут можна даведацца многа новага і цікавага.

Надзя і Лена ўзялі кніжку пра Белавескую Пушчу. Спачатку яны разглядалі цікавыя малюнкі, а потым пачалі чытаць кніжку.

Слоўнічак:

Бібліятэка – library.
Вокладка – book cover.
Малюнкі – pictures.
Ча́сапісы – magazines.
Пушча – вялікі, стары лес.
Белавеская пушча – найбольшая пушча Беларусі.

ЗАГАДКІ

Ня куст, а з лісточкамі; не кашуля, а сшыта.
Белае поле, чорнае насеньне, хто яго сее, той і разумее.

СВАІМ РОЗУМАМ

У школе сядзелі побач Янка і Кастусь. Янка быў шустры хлопчык, хутка думаў, бойка адказваў. Кастусь быў ціхі. Спачатку падумае, а потым адкажа. Задасьць настаўнік пытаньне. Не пасьпее Кастусь падумаць, а Янка падымае ўжо руку. Настаўнік кажа:

– Янка, пачакай, дай другім падумаць.

А Янка ня можа стрымаць сябе і пачынае гаварыць.

Кастусь злуецца. Ён ужо сам пасьпеў падрыхтавацца да адказу, таму й просіць Янку:

– Янка, не падказвай мне. Ты мне толькі перашкаджаеш. Я сам хачу думаць. Твае падказы мне не памогуць.

ПАДКАЗКА

– А хто я? – калі ласка,
Знаёмлюся з ахвотай:
Завуць мяне падказкай,
Сяброўкаю ляноты.

Хто абібок лянівы,
Хто нязвычайны лодар,
Я гэтаму зычліва
Падказваю заўсёды.

А хто салідна ў школе
трактуе абавязкі –
Ня будзе ён ніколі
Зьвяртацца да падказкі.

В. Швед

ВЕТЛІВАСЬЦЬ

Скончыліся заняткі. Пятрусь выйшаў са школы і накіраваўся да трамвайнага прыпынку. Дадому ён заўсёды ехаў трамваем.

Неўзабаве надыйшоў трамвай. Раптам Пятрусь убачыў, што да вагону сьпяшаецца дзядуля. У руках у яго былі пакункі. Дзядуля мог спазьніцца. Тады Пятрусь хуценька падбег да дзядулі і прапанаваў:

– Давайце, я вам памагу.

Пятрусь і дзядуля зайшлі ў вагон.

Дзядуля падзякаваў Пятрусю й папытаўся:

– Гэта вас так у школе вучаць?

– У школе, – адказаў Пятрусь.

– Добра вучаць, – пахваліў дзядуля. – Заўсёды будзьце ветлівымі.

---

1. Чым выказаў Пятрусь сваю ветлівасьць?
2. Ці вы таксама бываеце ветлівымі да іншых людзей?
3. Якім спосабам можна паказаць сваю ветлівасьць?

Слоўнічак:

Ветлівасьць – politeness.
Школьныя заняткі – school classes.
Трамвайны прыпынак – streetcar stop.
Неўзабаве – soon.
Прапанаваў – he offered help.

ДВА ТАВАРЫШЫ

Ішлі лесам два таварышы, і напаў на іх мядзьведзь. Адзін кінуўся бегчы, узьлез на дрэва й схаваўся. Другі застаўся на дарозе. Што тут рабіць? Ён упаў на зямлю й

прыкінуўся мёртвым.

Мядзьведзь падыйшоў да яго ды пачаў нюхаць, а ён і дыхаць перастаў.

Мядзьведзь панюхаў ягоны твар, падумаў, што ён мёртвы, і адыйшоў. Калі мядзьведзь пайшоў, першы таварыш зьлез з дрэва й сьмяецца.

– Ну што, – кажа, – мядзьведзь табе на вуха казаў?

– А ён сказаў мне, што дрэнныя тыя людзі, якія ў небясьпецы пакідаюць сваіх таварышоў, – адказаў другі.

Л. Талстой

Слоўнічак:

У небясьпецы – in danger.
Небясьпека – danger.
Небясьпечны – dangerous.

ЗАГАДКА

Крыльлі мае, высока лятае, людзей возіць, адпачынку ня просіць.

ДОБРАЯ ПАРАДА

Прачнуўся Юрка раніцай. Паглядзеў у вакно. Сонца сьвеціць. Дзянёк добры. Захацелася хлопчыку штонебудзь добрае зрабіць. Вось сядзіць ён і думае:

"Што каб мая сястрычка тапілася, а я яе выратаваў-бы!"

А сястрычка тут, як тут.

– Пагуляй са мной, Юрка!

– Адчапіся, не перашкаджай думаць!

Пакрыўдзілася сястрычка, і адыйшла.

А Юрка думае:

"Вось каб Мурза ў студню ўваліўся, а я яго выцяг-

нуў-бы!"

А Мурза тут, як тут. Хвастом віляе: "Дай мне напіцца, Юрка!"

– Пайшоў вон! Не перашкаджай думаць!

Палез Мурза ў кусты. А Юрка да мамы пайшоў.

– Што-б мне такое добрае зрабіць?

Паглядзела мама на сына і сказала:

– Пагуляй з сястрычкай, дай вадзіцы Мурзу, памажы пасуду прыбраць.

Слоўнічак:

Я яе выратаваў-бы – I would have saved her.
Сястрычка пакрыўдзілася – sister felt hurt.
Студня – a well.

УМЕЙ ПАЧАКАЦЬ

(Казка)

Жылі-былі сабе брат і сястра, певень ды курачка. Пабег певень у сад і пачаў дзяўбці зялёненькія парэчкі, а курачка і гаворыць яму:

– Ня еж, Пятрусь! Пачакай, пакуль парэчкі пасьпеюць.

Пеўнік не паслухаў: дзяўбаў ды дзяўбаў і надзяўбаўся так, што ледзь дамоў дабраўся.

– Ах! – крычыць пеўнік. – Бяда! Баліць, сястрычка, баліць!

Напаіла курачка пеўня мятай, прыклала гарчычнік – прайшло.

Паздаравеў пеўнік і пайшоў у поле: бегаў, скакаў, разагрэўся, успацеў і пабег да ручая піць халодную ваду, а курачка яму крычыць:

– Ня пі, Пятрусь, пачакай пакуль астынеш.

Не паслухаў певунік, напіўся халоднай вады – і тут пачала біць яго ліхаманка; ледзь дамоў курачка яго давяла.

Пабегла курачка па доктара, прапісаў доктар Пятрусю горкага зельля, і доўга паляжаў певунік у ложку. Паздаравеў певунік да зімы й бачыць, што рэчка лядком пакрылася. Захацелася певуніку на лёдзе пакоўзацца, а курачка гаворыць яму:

– Ой, пачакай, Пятрусь! Дай рацэ зусім замерзнуць: цяпер яшчэ лёд зусім тонкі, утопішся.

Не паслухаў певунік сястры, пакаціўся па лёдзе, лёд праламаўся, і певунік – бабух у ваду! Толькі певуніка і бачылі.

---

1. Ад чаго захварэў певунік першы раз?
2. Ад чаго захварэў ён другі раз?
3. Як ён вылечыўся ад гэтых хваробаў?
4. Што з ім нарэшце здарылася?

Слоўнічак:

Певень, певунік – rooster.
Парэчкі – currant.
Ліхаманка – гарачка, fever.

НАДЫХОД ЗІМЫ

Ударылі першыя маразы. Зямля стала цьвёрдай, як камень. Лужыны пазамярзалі. Замерзла з берагоў і вада ў рэках. Шэрыя хмары завалаклі ўсё неба. Павольна пачалі падаць першыя сьняжынкі. Потым пайшоў густы сьнег.

Ідзе сьнег дзень, другі, трэйці... Уся зямля становіцца белай, бы вата. На вуліцу з вясёлым сьмехам выбя-

гаюць дзеці. Яны лепяць першыя сьнежкі, і цешацца, што прыйшла зіма.

СЬНЕГ

Андрэйка прачнуўся раніцай і ўбачыў, што на двары выпаў сьнег. Андрэйка быў яшчэ зусім малы, ня ведаў, што такое сьнег, і закрычаў:

– Вунь колькі цукру рассыпана!

Старэйшыя браты засьмяяліся і прынесьлі Андрэйку жменю сьнегу. Андрэйка лізнуў яго, скрывіўся й кажа:

– Халодны!

Потым паклаў сьнег на печ грэць.

Па абедзе Андрэйка падыйшоў да печы й раптам заплакаў на ўсю хату. Маці пытаецца ў яго:

– Чаго ты плачаш? Што здарылася?

А Андрэйка кажа:

– Сьнег нехта забраў. Я паклаў яго на печы грэцца.

Усе засьмяяліся, а Андрэйка глядзеў на іх і ня ведаў, чаго яны сьмяюцца.

Жменя сьнегу – Handful of snow.

ДЗЯЎЧЫНКА І СЬНЯЖЫНКА

Кружэўныя сьняжынкі
За шыбінамі кружаць,
А ля акна дзяўчынка
За імі надта тужыць.

Ды вырваўшыся з хаты
На белы сьвет зімовы,
Падняўшы ручаняты
У іх сьняжынкі ловіць.



А. Стагановіч

Вось на малой далоні
Сьняжынку мае Тоня.
Заплакала сьняжынка,
Заплакала дзяўчынка.

В. Швед

НА ЛЫЖАХ

Толькі выпаў першы сьнег —
Мы на лыжы сталі,
Звонкі гоман наш і сьмех
Абуджае далі.
Мы імчым з крутой гары,
Усьлед шумяць бярозы.
Ня пужаюць нас вятры,
Халады, марозы.

ДЗЕНЬ І НОЧ

Зімою сонца позна ўзыходзіць і рана заходзіць. Таму дзень зімою кароткі, а ноч доўгая. Ідуць дзеці ў школу, калі яшчэ цёмна.

Дваццаць другога сьнежня найкарацейшы дзень і найдаўжэйшая ноч. Потым дні большаюць, и ночы робяцца карацейшымі.

НА КАНЬКОХ

Разгулялася мяцеліца,
Белы сьнег навокал сьцелецца.
Закуецца рэчка льдзінамі,
На канькох на рэчку рынем мы.

З горкі возьмем мы разгон,
Ветру рушым наўздагон.
Пад канькамі льдзінкі звоняць,
Нас і вецер не дагоніць.

ЗАГАДКА

На дварэ гарой, а ў хаце вадой.

ХТО ЯК ЗІМУ СУСТРАКАЕ

Пад елачкай, пад зялёнай — хатка зайчыка. К зіме зьмяніўся зайчык з выгляду. Шэрая летняя поўсьць выпала. Замест яе вырасла сьветлая, пушыстая. Цёпла ў ёй будзе зайчыку зімою, ды і ворагу цяжэй заўважыць яго на сьнезе.

Лісічка норку падрыхтавала. У норцы з мяккога ліс-

ця цёплую пасьцель сабе зрабіла.

Вожык-калючка накрыўся сухім лісьцем і заснуў на цэлую зіму.

Жабкі-квакушкі закапаліся ў іл і ляжаць нярухома.

Крот глыбока залез у зямлю й таксама заснуў.

Мішка крывалапы забраўся ў бярлогу і сьпіць.

Не да спачынку бяздомнаму ваўку. Валочыцца ён цэлую ноч у пошуках ежы ды заводзіць на ўвесь лес свае воўчыя песьні.

---

1. Выпішы з апавяданьня назовы ўсіх зьвяроў!
2. Каторыя зь іх сьпяць цэлую зіму?

Слоўнічак:

Вожык — porcupine.
Вораг — enemy.
Іл — silt (in the river)
Крот — a mole.

МАРОЗ

Ой, які благі мароз:
Шчыпле вушы, шчыпле нос.
Мы адзелі рукавіцы,
А мароз нас не баіцца.

Як пачалі працаваць —
Сьнег лапатамі кідаць,
Накладаць яго на воз, —
Перастаў пужаць мароз.

ПТУШКІ ЗІМОЮ

Дрэнна птушкам зімою. Зямля пакрытая сьнегам, навет на дрэвах сьнег.

На дварэ холадна. Трашчаць маразы.

Птушкі, якія зімуюць у нас, набліжаюцца да чалавечага жыльля. Тут хутчэй яны знойдуць сабе ежу.

Скачуць па сьнезе верабʼі, падбіраюць крошкі. Галкі і вароны цэлымі стаямі кружацца каля двароў, шукаюць пажывы.

Навет асьцярожныя сарокі наведваюць вёскі і невялікія гарады. Каля людзей спадзяюцца яны чым-небудзь пажывіцца.

ВЕРАБЕЙЧЫК

Вось прыйшлі зімовы сьцюжы,
На дварэ замерзьлі лужы;
Скача, скача верабей,
Ён склікае ўсіх дзяцей.

Да дзяцей ён просьбу мае
І чырыкае, як знае:
– Ціў-ціў-ціў, ціў-ціў-ціў!
Дайце есьці – я ледзь жыў!

Есьці многа мне ня трэба:
Трохі зерня, трохі хлеба
Кіньце дзеткі на зямлю,
Я вам песеньку сьпяю.

Зерне, зярняты – grains.

ЗАГАДКА

Адгадайце, што за хатку
Змайстравалі мы з Ігнаткам:
Дах, падлога, скарб усякі,
Толькі сьцен няма ніякіх,
І, вядома, ад таго –
І акна ні аднаго...
А стаіць яна ў садку,
На бярозавым суку:
Тут і хлеб, тут і зярнятка...
Ну, дык што гэта за хатка?

І. Шуцько

Слоўнічак:

Скарб – treasure.
Зярнятка – a little grain.

ДЗІЎНЫ МАСТАК

Як прачнуўся Тодар рана,
Праз акно зірнуў на двор
І зьдзівіўся – маляваны
Шыбы ў рознастайны ўзор.

Як тут многа прыгажосьці!
Хто-ж намаляваць мог так?
Быў, відаць, тут нашым госьцем
Нейкі ведамы мастак.

– Быў мастак тут, – кажа мама,
Фарбаў срэбных шмат прынёс,
З барадою ён, вусамі,
А завуць яго – мароз.

В. Швед

ПОРЫ ГОДУ

Сьнег на полі,
Лёд на рэчцы,
Мяцеліца гуляе –
Калі гэта бывае?

Растае сьняжок,
Ажыў лужок,
Дзень прыбывае –
Калі гэта бывае?

Сонца пячэ,
Ліпа цьвіце,
Збожжа дасьпявае –
Калі гэта бывае?

Пуста ў палёх,
Мокне зямля,
Дождж па лівае –
Калі гэта бывае?

Слоўнічак:

Мяцеліца – snowstorm.
Ліпа – linden tree.
Збожжа – grains (wheat, rye)
Луг, лужок – meadow.

МЕСЯЦЫ

Студзень – году пачатак, зімы сярэдзіна.
У лютым маразы злосныя, лютыя.
У сакавіку сок у дрэвах пачынае рухацца.
У красавіку зьяўляюцца краскі.
У маі, або травенем званым, травы многа, зелена й прыгожа ўсюды.
У чырвені чырванеюць суніцы.
У ліпені цьвітуць ліпы.
У жніўні жыта дажынаюць.
У верасьні верасы цьвітуць.
У кастрычніку кастрыца ляціць ад лёну і канапель, калі іх мнуць і трэплюць.

У лістападзе апошнія лісты ападаюць.
У сьнежні сьнягі зямлю пакрываюць.

Слоўнічак:

Суніцы — strawberries.
Дажынаюць жыта — they finish harvesting rye.
Кастрыца — tow (from flax).
Лён — flax.
Каноплі — hemp.

ДВАНАЦЦАЦЬ ПТУШАК

Ляціць дванаццаць птушак.

Лятуць першыя тры: на дварэ завеі, маразы, вятры.

Паляцелі тры наступныя: сьнег зьнікае, усё аджывае.

Узьнялася трэйцяя тройка: зрабілася горача, сьпякотна.

А як пачалі ляцець чацьвертыя тры — паплылі хмары, пайшлі дажджы, узьняліся вятры.

А птушкі тыя ня простыя: у кажнай па чатыры крылы, а ў кажным крыле па сем пер'яў.

Кажнае пяро сваё імя мае і напалавіну белым, напалавіну чорным бывае.

Махне птушка крылом — зробіцца сьветла-сьветла, махне другім — цёмна-цёмна.

---

1. Што гэта за птушкі? Назавеце іх па парадку!
2. Чаму сказана, што яны ляцелі па тры?
3. Чаму сказана, што ў кажнай па чатыры крылы?
4. Што гэта за пёры ў кажным крыле? Назавеце па парадку дні тыдня!

Завеі — snowbanks.
Сьнег зьнікае — snow is disappearing.

ЛЯСНЫЯ ДАКТАРЫ

Пук, пук, стук, стук, пук, пук.
Сасна, бяроза, бук
Хварэюць у бары,
А мы – іх дактары.

Нас, дзятлоў – дактароў
Тут шмат паміж ствалоў.
Мы даглядаем бор,
Каб хтосьці не памёр.

Калі хто хворы з вас,
Дык пазавеце нас.
Злых шкоднікаў з кары
Вам выймуць дактары.

В. Швед

Слоўнічак:

Дзятлы – woodpeckers.
Адзін дзяцел – one woodpecker.
Ствалы – tree trunks.
Бор – pine forest.
Шкоднікі – vermin, harmful insects.
Кара – bark on a tree.

КАЗКА ПРА ЛІСУ

Жылі сабе дзед ды баба. Дзед кажа бабе:

– Ты пячы пірагі, а я паеду па рыбу.

Налавіў дзед рыбы і вязе дамоў. Убачыла яго ліса. Захацелася ёй рыбкі пакаштаваць.

Забегла яна наперад, лягла на дарозе ды ляжыць, як мёртвая.

Пад'ехаў дзед, падыйшоў да лісічкі, а яна і не варухнецца.

— Вось будзе добры каўнер бабе, — кажа дзед.

Узяў ён лісічку й палажыў на воз, а сам пайшоў сьпераду. А лісічка ціхенька пачала ськідаць з воза па аднэй рыбцы.

Выкінула ўсю рыбу і сама ўцякла.

Прыехаў дзед дахаты.

— Ну, баба, — кажа дзед, — якую лісіцу прывёз я табе на каўнер!

— А дзе яна?

— Там, на возе, разам з рыбай.

Падыйшла баба да воза, а там — ні лісіцы, ні рыбы.

Тут дзед здагадаўся, што лісіца была ня мёртвая; пагараваў, пагараваў, ды нічога ня зробіш.

Ч А М У ?

Вара і Віця пайшлі да Любы на нарадзіны.

Цяпер яны варочаюцца дадому. Вечар. Зрабілася зусім цёмна. Яны трымаюцца за рукі. Дарогі ўжо ня відаць.

Але вось паміж дрэвамі паясьнела. Праз момант з-за гальля выйшаў месяц — вялікі, круглы, ясны.

Дзеці ўжо не баяцца. Ідуць сьмела, бо выразна бачаць сьцежку. Нарэшце прыйшлі дахаты.

Калі яны ўжо стаялі на парозе, адвярнуліся да друга-месяца й крыкнулі яму:

— Дзякуй табе, месячык!

А месяц на гэта:

— Што-б гэта было, калі-б вы варочаліся так позна два тыдні таму назад? Тады-б я вам не пасьвяціў.

— А чаму? — спыталіся дзеці.

Але якраз у гэты момант хмарка закрыла месяц, дык ён ня ўсьпеў адказаць. А вы, ці вы ведаеце чаму?

Слоўнічак:

Нарадзіны – birthday.
З-за галінаў – from behind the branches.
Сьцежка – path.

СЫНЫ

Тры жанчыны выйшлі з прадуктовае крамы. Спыніліся каля лаўкі, паставілі на яе цяжкія пакункі з прадуктамі. Побач на лаўцы сядзеў стары дзядок, адпачываў.

Разгаварыліся жанчыны пра сваіх сыноў. Адна кажа:

– Мой сынок спрытны і дужы – ніхто з ім ня зладзіць.

– А мой дык сьпявае, як салавей. Ніхто такога голасу ня мае, – кажа другая.

А трэйцяя маўчыць.

– Што-ж ты пра свайго ня скажаш? – пытаюцца ў яе суседкі.

– А што сказаць? – адказвае жанчына. – Нічога ў ім асаблівага няма.

Вось пабралі жанчыны свае пакункі ды пайшлі. А дзядок за імі. Ідуць жанчыны, спыняюцца, перамяняюць рукі. Цяжка ім.

Раптам насустрач тры хлопчыкі выбягаюць. Адзін мяч падкідае й на бягу яго ловіць. Цешацца з яго спрыту жанчыны.

Другі песьню сьпявае, салаўём заліваецца. Заслухаліся жанчыны.

А трэйці да маткі падбег, узяў у яе з рук пакунак і

панёс яго.

– Ну што? Як падабаюцца нашы сыны?

– А дзе-ж яны? – адказвае дзядок. – Я толькі аднаго сына бачу!

І дзядок паказаў на хлопчыка, які ў маткі пакунак узяў.

---

1. Чаму дзядок сказаў, што бачыць толькі аднаго сына?

Слоўнічак:

Спрытны – skillful, clever.
Дужы – strong.
Нічога асаблівага – nothing special.
Жанчыны спыніліся – women stopped.
Выбягаюць насустрач – they ran out to meet them.
Салавей – nightingale

ДОБРАЯ РАБОТА

Штодзень вечарам Янук працуе. Чысьціць боты сабе, бацьку і маме. Спачатку ўсе боты ставіць у радок. Гаворыць з імі:

– Так, стойце спакойна ў радку і чакайце, аж прыйдзе ваша чарга.

Пара за парай бярэ боты да чышчэньня. Саскробвае паленцам гразь, потым мажа боты ваксаю і чысьціць іх шчоткай, аж блішчаць як люстра. Кажа:

– Ты прыгожы, боцік, прыгожы як новы! Але пачакай сабе яшчэ на другі, на сваю пару.

Часам Янук чысьціць сьпярша ўсе левыя боты, часам усе правыя. Сьмяецца, калі паставіць ачышчаныя боты побач з бруднымі:



— Адны, як люстра, а другія як гразь!

Ачысьціўшы ўсе боты, складае ў парадак шчоткі і ваксу. Мые рукі ды кажа:

— Усё гатова!

Бацька кажа:

— Наш Янук — гэта бравы хлапчук. Ён ужо ўмее добра працаваць.

ЛЯЛЕЧНЫ ТЭАТР

— Аб чым гэта будзе? — распытваюцца дзеці, якія яшчэ ніколі ў запраўдным тэатры ня былі.

— Аб чырвонай шапачцы. Пабачыце казку, якую вы напэўна ўсе ведаеце.

У тэатры ціханька, хоць дзяцей поўна.

Першы званок. Другі званок. Гасьне сьвятло. Праз хвілінку расьхілілася заслона.

Нарэшце. Малая лялька ў чырвонай шапачцы вымахвае ручкаю і круціць галоўкай у вабодва бакі. А другая лялька, адзетая за бабулю, сьмешна грозіць пальцам.

Марыська штурхае Варку:

– Ці гэта жывыя людзі?

– Не, гэта лялькі, – шэпча Варка й кладзе палец на губах, бо тут нельга гаварыць.

Цяпер з лесу выходзіць вялікі шэры воўк. Падымае галаву й воўчым голасам вые. Марыся сьпярша крыху спалохалася, але праз момант засьмяялася ўголас. Гэта-ж ня воўк, гэта-ж таксама лялька.

Ой, будзе што расказваць, вярнуўшыся дадому!

ПРАЦАВІТАЯ ДАЧУШКА



А. Стагановіч

Лідачка штодзень у хаце
Памагае ў працы маці.
Падмяце пакой прыгожа,
З густам свой пасьцеле ложак,

Прынясе вады вядзерца,
Сьнедаць дасьць маленькай Верцы,
Выпрасуе свой каўнерык,
Торбу з кніжкаю праверыць,
І з усьмешкаю вясёлай
Пабяжыць тады ўжо ў школу.
– Вось дык слаўная дачуся, –
Не нахваліцца мамуся.
– Ленавацца надта брыдка, –
Пераконвае ўсіх Лідка.

В. Швед

ДАЛЁКА ДА СОНЦА



А. Стагановіч

Мама вымыла кашулю
І сказала малой доньцы:
– Даражэнькая Гануля,
Ты павесь яе на сонцы.

З недаверам пазірае
Ганя ў неба сумным зрокам:
– Мама, я-ж яшчэ малая,
А да сонца так далёка...

В. Швед

ПА СЯБРОЎСКУ

Віця згубіў сьнеданьне. На перапынку ўсе дзеці сьнедалі, а Віця стаяў збоку.

– Чаму ты ня сьнедаеш? – папытаўся Міколка.

– Сьнеданьне згубіў...

– Дрэнна, – сказаў Міколка, адкусваючы вялікі кавалак белага хлеба. – Да абеда далёка яшчэ!

– Дзе ты яго згубіў? – папытаўся Валодзя.

– Ня ведаю, – ціха сказаў Віця і адвярнуўся.

– Ты напэўна ў кішані нёс, а трэба ў торбу класьці, – сказаў Валодзя.

А Міхась нічога ня пытаўся. Ён падыйшоў да Віці, адламаў палову кавалка хлеба з маслам і даў сябру:

– Бяры, еж!

ВУЧЫСЯ

І покуль ты яшчэ малы
Ці малады задужа,
Сядай за лаўкі і сталы
І навучайся, дружа!

А вырасьцеш праз колькі год,
Ня будзеш мець турботы:
Краіна наша і народ
Дадуць табе работу.

Ты інжынерам можаш быць,
Вучоным і шахцёрам;
Ты капітанам можаш плыць
Азёрамі і морам.

П. Глебка

ЯК ЛЮДЗІ НАВУЧЫЛІСЯ ЕСЬЦІ БУЛЬБУ

Можа вы ня ведаеце, што бульба, якую мы цяпер ямо штодзень, пару соцень год таму была зусім невядомай у Беларусі расьлінай. А калі бульбу пачалі прывозіць з-за мора, з Амэрыкі, то яна была такая дарагая, што мала хто мог яе купіць.

Аднаго разу здарылася, што багаты пан купіў гэта заграністае дзіва, і загадаў агародніку пасадзіць яго старанна ў пульхную зямлю. І вось вырасла зялёная сьцяблінка, а на ёй неўзабаве зацьвіў прыгожы, белы цьвет.

– Калі гэты цьвет зьвяне, – падумаў сабе агароднік, тады напэўна паявяцца прыгожанькія плады.

Так яно і было. Паміж лісточкамі на жаўцеючым сьцябле вырасьлі зялёныя, цьвёрдыя шарыкі. Яны былі вялічынёю з гарэх, а пад скуркай у іх было насеньне.

– О, якія прыгожыя, – усьцешыўся агароднік, – вось-жа будзе смачная страва.

Ён сарваў зялёныя гарэшкі, а кухар зварыў іх, паліў маслам і багата пасыпаў цукрам. Запрасілі гасьцёў на банкет, але нарыхтаваная ежа была горкая, цьвёрдая, і ніхто не хацеў яе есьці.

Узлаваўся пан, загадаў разьвесьці вялікі агонь, вырваць расьліну з карэньнем і зьнішчыць яе раз на заўсёды. Але што за чары! Калі вогнішча астыла, знайшлі ў попеле бурыя клубені, мяккія і смачныя. – Ага, я ўжо ведаю! – сказаў агароднік, – гэта не вяршкі трэба есьці, толькі клубені.

Цяпер ніхто ўжо напэўна не абмыліцца і ня зварыць супу з маленькіх зялёных плодзікаў бульбы.

---

1. Адкуль прывезьлі бульбу на Беларусь?

2. Чаго ня ведаў агароднік? Якую ён зрабіў абмылку?
3. Як нарэшце навучыліся людзі есьці бульбу?

Слоўнічак:

Загранічнае дзіва — a wonder from abroad.
Пульхная зямля — soft earth.
Плады — fruits.
Насеньне — seeds.
Што за чары? — what magic?
Бурыя клубені — brown bulbs.

СЕЛЯНІН І МЯДЗЬВЕДЗЬ

(Народная казка)



Пасябраваў мядзьведзь з селянінам, і надумаліся яны разам рэпу сеяць. Селянін сказаў: "Мне карэнчык, а табе, Міхайла, вяршок".

Вырасла слаўная рэпа: селянін узяў сабе карэньні, а

Міхайлу аддаў вяршкі. Пабурчэў Міхайла, ды што зробіш.

На другі год кажа селянін мядзьведзю: "Давай зноў разам сеяць".

– Давай! Толькі цяпер ты сабе бяры вяршкі, а мне аддай карэньні, – умаўляецца мядзьведзь. "Добра! – кажа згаворлівы селянін, – хай будзе патвойму". І пасеялі пшаніцу.

Добрая пшаніца зарадзіла: селянін атрымаў вяршкі, а Міхайла карэнчыкі.

З таго часу мядзьведзь перастаў сябраваць з селянінам.

Слоўнічак:

Рэпа – beets.
Пшаніца – wheat.
Сеяць – to sow (wheat)

МАЯ СЯМ'Я

Задам табе задачу я.
Паслухай, вось мая сям'я:
Дзядуля, бабка, брат.

У нас парадак, лад,
Заўсёды чыста ў хаце,
Бо ў хаце ў нас дзьве маці,

Два бацькі, два сыны,
Дачка, пляменьнік і сястра,
А самы меншы – я.

Цяпер табе зьлічыць пара –
Якая ў нас сям'я?

Васіль Вітка

АСУШЭНЬНЕ БАЛОТА

На дзесяткі кілямэтраў па берагох рэчкі ляжала балота. Ні прайсьці, ні праехаць!

– Гіблае месца! Дарма зямля прападае, – казалі пра яго сяляне.

Але вось на балота прыйшлі інжынеры. Агледзелі балотную дрыгву і сказалі:

– Тут прападае выдатнае паліва – торф.

Хутка балота ажыло. Сюды прыйшлі работнікі. Зазьвінелі рыдлёўкі. Запрацавалі землячарпалкі. Залязгалі ваганэткі.

На балоце ляглі канавы. Па канавах вада пацякла ў рэчку.

Асушылі балота.

---

1. Як асушылі балота?
2. Якую гэта дало карысьць?
3. Што такое торф?

Слоўнічак:

Балота – marsh, swamp.
Паліва – fuel.
Рыдлёўка – лапата.
Чэрпаць (ваду або зямлю) – to draw (water)
Канавы – drainage ditches.

ЗІМА НАБЛІЖАЕЦЦА

Пасьля школы Люба звычайна праводзіць Яру дадому. Але сяньня Люба кажа:

– Не магу цябе правесьці. У мяне важныя заняткі.

– Якія? – пытаецца зацікаўленая Яра.

– Мама казала, што сяньня будзем пераглядаць зімовую вопратку.

І Люба з торбаю на плячох адыходзіць борздым крокам. З дрэў ападае апошняе жоўтае лісьце.

Дома Любу сустракае мама з ветлівай усьмешкай.

У пакоі стаіць адчынены ўжо куфар. Пахне нафталінам, якім пасыпалі вопратку вясною, каб молі не павыгрызалі ў ёй дзірак.

Пасьля вячэры дзеці абступаюць куфар. Люба выймае па чарзе польты і шалікі Адася і малога Алеся.

Мама думае. Алесь атрымае пальто Адася. Адась з яго ўжо вырас. Адасю купілі новае пальто. Каб Алесь не маркоціўся, атрымае цёплыя рукавіцы, добра?

– Добра, – згаджаецца Алесь.

Цяпер Люба нецярпліва шукае ў куфры сваю вопратку. Хутка надзяе пальто. Яно кароткае і цеснаватае ў плечах. Люба падрасла за лета.

– Купім і табе новае пальто, – кажа мама.

– А гэтае пальто я аддам аднэй дзяўчынцы з Адасёвай клясы, можна? – пытаецца Люба.

– Калі ласка, – адказвае мама.

Назаўтра кажа Люба Яры:

– Ці ведаеш, Яра, што ў нас было ў куфры на дне? Мішка! Наш дарагі Мішка. Мы яго шукалі па ўсім доме, а ён замест зімы лета праспаў у куфры.

---

1. Чаму Любіна мама пераглядала зімовую вопратку?
2. Што знайшлі дзеці на дне куфра?

Слоўнічак:

Занняткі – Occupation, work.

Адыходзіць борздым крокам – she walks away quickly
Крок – step.
Ветлівая усьмешка – ■ kind smile.
Нецярпліва – impatiently.
Бязумоўна – of course!

ЛІСТАПАД

З буйных ліп і бяроз
Лісты валяцца,
Між павалаў і лоз
Рассыпаюцца.
Шапацяць, шалясьцяць
Залацістыя,
Увысь галінкі глядзяць
Пусталістыя.
А як прыйдзе вясна,
Усё адменіцца,
І галінкі ізноў
Зазяленяцца.

Я. Купала

АПАЛ НА ЗІМУ

Прыемна зімою сядзець у цёплай хаце. Міхась любіць глядзець, як мама кладзе ў печ брускі торфу, якія ў кашы былі бурыя, а пад плітой робяцца чырвонымі.

– Але цёпла ў нас сёлета, – кажа Міхась.

– Бо раней мы палілі дрывамі, а цяпер палім торфам, кажа мама. – А торф дае больш цяпла, бо даўжэй гарыць.

У земляробскім каапэратыве Бярозаўка летась першы раз узяліся капаць торф. Міхасёў бацька кіраваў групай торфакопаў.

Міхасю вельмі хацелася паглядзець, як торф здабываецца. Аднойчы ён папрасіў бацьку.

– Тата, паеду з вамі на торф...

– А нашто?

– Коні буду паганяць...

– Ну, добра, – згадзіўся бацька.

Бацька запрог чацьвёра коняй у машыну. Потым махнуў пугай і коні пайшлі кругом, так як у маняжы.

Мама першая падставіла сваю дошчачку пад адтуліну машыны. Калі торф пакрыў усю дошчачку, мама падхапіла яе ўверх. Тымчасам ужо нехта іншы падставіў сваю дошчачку, а мама пабегла з торфам, каб палажыць яго на падрыхтаваным раней месцы.

Трэба было добра завіхацца, каб не адстаць у рабоце за машынай. Да паўдня на лузе стаяла шмат кучак здабытага торфу.

У час перапынку, калі ўсе паселі, каб адпачыць, Міхась папытаўся ў бацькі:

– Тата, а чаму цяпер ня будзем паліць дрывамі?

– Бо, бачыш, драўніну трэба ашчаджаць, – адказаў бацька. – Драўніна патрэбная для пабудовы дамоў, на паперу, на мэблю і на шмат іншых рэчаў. А торф добра гарыць, і яго тут колькі хочаш.

---

1. Раскажы, як здабываюць торф!
2. Чаму ў хаце цяплей, калі паліць торфам?
3. Скуль бяруць драўніну?
4. Чаму яе трэба ашчаджаць?

Слоўнічак:

Торф – peat.
Брускі торфу – square pieces of peat.

Буры — brown.
Пуга — whip.
Перапынак — a break, pause.
Драўніну трэба ашчаджаць — we must save wood.
Мэбля — furniture.

СІНІЯ ЛІСТОЧКІ

У Каці былі два зялёныя алавікі, а ў Ганны ніводнага. Дык Ганна просіць Кацю:

— Пазыч мне зялёны алавік.

А Каця кажа:

— Папытаюся ў мамы.

На другі дзень прыходзяць абедзьве дзяўчынкі ў школу. — Дазволіла мама? — пытаецца Ганна.

— Мама дазволіла, але я баюся, што ты зломіш алавік.

— Я буду рысаваць асьцярожна, — кажа Ганна.

— Ну, глядзі, — кажа Каця, — не завострывай яго, ня прыціскай моцна, не бяры ў рот. І шмат ня рысуй.

— Толькі лісточкі на дрэвах нарысую і зялёную траўку.

— Гэта шмат, — кажа Каця і нахмурыла бровы.

Глянула на яе Ганна ды пайшла сабе. Не ўзяла алавіка. Каця, зьдзіўленая, пабегла за ёю.

— Ну, што-ж ты? Бяры!

— Ня трэба, — кажа Ганна.

На лекцыі настаўнік пытаецца:

— Чаму ў цябе, Ганначка, лісьце на дрэвах сіняе?

— Бо ў мяне няма зялёнага алавіка.

— Чаму-ж ты не ўзяла ў сяброўкі?

Ганна маўчыць. А Каця зачырванелася як рак і кажа:

— Я ёй давала, але яна не хацела ўзяць.

Глянуў настаўнік на абедзьве дзяўчынкі, і сказаў:

— Трэба так даваць, каб можна было ўзяць.

ДЗЕ АНТОСЯ?

Янка малы. Ходзіць у першую клясу. Антося вялікая. Яна ходзіць ужо ў другую клясу. Янка ведае, што Антося многа, многа за яго мудрэйшая. Мама пацяшае Янку, што праз год і ён будзе такі самы мудры.

У школе будзе спэктакль. Антося будзе выступаць, а Янка не. А чаму? Бо Антося ўмее чытаць і сама можа навучыцца ролі.

Але Янка ня сумуе, бо Антося яму сказала:

– Затое ты будзеш глядзець на спэктакль, а я не. І ты ўсё ўбачыш. Я буду схаваная за сцэнай і толькі тады пакажуся, калі буду патрэбная.

Дык Янка цешыцца, што ён усё ўбачыць. Ен вельмі цікавіцца, чым будзе Антося. Але Антося ня хоча сказаць. Гэта таямніца.

Урэшце прыходзіць тая нядзеля і той спэктакль. Янка сядзіць у першым радзе між першаклясьнікамі.

На сцэне рухаюцца розныя дзівосныя стварэньні. Сьпяваюць, танцуюць і нешта расказваюць. Янка ня вельмі ўважае.

Ён цікуе, дзе Антося.

Ня можа яе знайсьці. Усе кветкі ўжо пазнаў. Гэта Галя, гэта Ева, гэта Марыся з-пад лесу. Антосі няма.

Танцуюць кветкі, скачуць грыбы. Грыбы – гэта хлопцы. Антосі нідзе ня відаць.

Цяпер на сцэну – кляп, кляп – уваходзяць дзьве зялёныя жабы. Але твараў ня відаць – заслоненыя жабімі сьмешнымі маскамі. Крэхчуць, кумкаюць.

Янка ўжо нецярплівіцца. Дзе-ж гэта Антося? Ці яе ня пусьцяць на сцэну?

– Антося! – крычыць ён.

— Ціха! — зьвяртаецца да Янкі адна жаба. Янка ўжо ведае! Антося — жабаю! Пазнаў па голасе.

---

1. Чаму Антося прыймала ўдзел у спэктаклі, а Янка ня мог?
2. З чаго Янка цешыўся?
3. Чаму Янка ня мог пазнаць сястру?

Слоўнічак:

Таямніца — secret.
Дзівосныя стварэньні — weird creatures.
Ён ня сумуе — he is not sad, he doesn't worry.
Сумны — sad.
Ня вельмі ўважае — he doesn't pay much attention.
Увага — attention.
Янка нецярплівіцца — Yanka is getting impatient
Прымаць удзел (у спэктаклі) — to take part (in a play)

ВЯСНУШКІ

Ад маленства мае Жэня
Поўны тварык рабаценьня.
На'т на носіку і вушках
Разьмясьціліся вяснушкі.
Дзеці ў школе празываюць
Жэню найчасьцей "рабая".
Больш прыстойную мянушку
Жэні надалі: "вяснушка".
Нехта на'т прыдумаў лоўка:
"Жэня — божая кароўка".
І злуе заўсёды Жэня
На дзяцей, на рабаценьне.
Жэня марыць: неяк мушу
Вызваліцца ад вяснушак.

А ў сапраўднасьці ў Жэні
Тварык мілы ў рабаценьні.

В. Швед

Слоўнічак:

Вяснушкі, рабаценьне — freckles.
Мянушка — nickname.
Яна марыць — she is dreaming.

ПЕРШЫ РАДЫЁПРЫЁМ

Сяньня на лекцыі дзеці пачуюць першы раз школьны радыёпрыёмнік.

Дык усе чакаюць. Чакаюць ціханька. Толькі Вара й Марылька, гэтыя прыяцелькі з трэйцяй лаўкі, усьцяж шэпчуцца. Аж іншыя дзяўчаткі іх суцішаюць.

— Ужо можна ўлучыць, — кажа настаўніца.

— Дык и ўлучу! — просіць Франук.

— Добра, згаджаецца настаўніца. І Франук перакруціў кнопку радыёпрыёмніка.

Спачатку ціха, потым голасна гучыць музыка. І раптам ціхне.

— А-ей, папсавалася! — крычыць спалоханая Вера.

Не, не папсавалася. Праз момант раздаецца бадзёры сыгнал.


І адзываецца мілы голас:

— Добры дзень, дзяўчаткі і хлапцы. Даем радыёперадачу для школаў.

— Ціха! — шэпчуць дзеці, бо Вара й Марылька падарваліся з месцаў.

А голас гаворыць далей.

— Але сьпярша мы хочам прывітаць нашых новых слухачоў. Сяньня першы раз слухае нас школа ў Петкавічах.



Мы даведаліся пра гэта з ліста Вары і Марылькі з другое клясы. Вітаем дзяцей з Петкавіч. А цяпер паслухайце казку пад загалоўкам: "Пяцёра ў вадным стручку".

Усе сядзелі ціханька і слухалі. Толькі пасьля перадачы падняўся гоман. Марылька і Вара са сто разоў расказвалі, як гэта было з гэтым лістом.

ПЯЦЁРА Ў ВАДНЫМ СТРУЧКУ

I.

Было сабе пяць зярнятак гароху ў вадным стручку. Усе яны былі зялёныя, і стручок быў зялёны, дык яны думалі, што ўвесь сьвет зялёны. Стручок рос, і зярняткі гароху расьлі. Сядзелі сабе радам адно за другім. Сонца сьвяціла і грэла стручок, дождж яго абмываў. Было цёпла і добра, ясна ўдзень і цёмна ўночы, так як быць павінна. Зярняткі гароху рабіліся з кажным днём боль-

шыя і ўсё часьцей думалі аб тым, што трэба ўсё-ж такі чым-небудзь заняцца.

– Ці-ж заўсёды будзем тут сядзець? – пыталіся. – Адьвярдзеем ад гэтай сядні. Нам здаецца, што надвары нешта робіцца, мы гэта чуем.

Прайшлі тыдні. Зярняткі гароху зрабіліся жоўтыя, і стручок таксама зжаўцеў.

– Увесь сьвет робіцца жоўтым, – падумалі яны.

Раптам яны адчулі моцны ўскалот. Нехта сарваў стручок.

– Цяпер нас неўзабаве адчыняць, – сказалі зярняткі і чакалі на гэты момант.

– Хацела-б я цяпер ведаць, хто з нас найдалей зойдзе, сказала найменшае зярнятка.

– Гэта хутка пакажацца.

– Хай будзе, што будзе! – заявіла найбольшае зярнятка.

Трах! Стручок лопнуў, і ўсе пяць зярнятак пакаціліся ў ясных праменьнях сонца. Яны ляжалі на дзіцячай далоні. Нейкі хлопчык трымаў іх і казаў, што гэта будуць добрыя набоі да ягонай стрэльбы. Неўзабаве адно зярнятка апынулася ў стрэльбе, і хлопчык стрэліў.

– Цяпер я ляту ў далёкі сьвет! Хай мяне хапае той, хто можа! – крыкнула зярнятка й паляцела.

– А я ляту проста да сонца! – сказала другое зярнятка.

І паляцела.

– Дзе-б мы не апынуліся, будзем сабе спаць, – сказалі два наступныя зярняткі.

І пакаціліся па падлозе. Але іх таксама набілі ў стрэльбу.

– Мы трапім найдалей! – крыкнулі.

— Хай будзе, што будзе! — крыкнула апошняе зярнятка і выстраліла ў паветра. Яно паляцела да акна на падстрэшшы, трапіла ў шчыліну, напоўненую мохам і мяккою зямлёю. Мох яго атуліў, і яно ляжала там забытае.

— Хай будзе, што будзе! — сказала яно.

II.

У маленькім пакоіку на падстрэшшы жыла бедная жанчына, якая цяжка працавала ў людзей. Паліла печы, секла дровы. Яна была дужая і ахвотная да работы, але ня гледзячы на гэта, жыла заўсёды ў нястачы. Дома, у малым пакоіку пад страхою яна пакідала сваю адзіную маленькую дачушку, далікатную і кволую. Дзяўчынка праз цэлы год ляжала ў ложку, і здавалася, што яна ня хоча ні жыць, ні паміраць.

Калі маці ішла на работу, яна ляжала цярпліва і спакойна цэлы дзень.

Была вясна. Праменьні ўзыходзячага сонца падалі праз малое аконца на падлогу, а хворая дзяўчынка ўглядалася ў найніжэйшую шыбку.

— Што там такое зялёнае вызірае з-за шыбы і рухаецца на паветры?

Маці падышла да акна і адчыніла яго.

— Ах, — сказала, — гэта маленькі гарох, які выпусьціў зялёныя лісточкі. Якім спосабам у шчыліну магло трапіць зярнятка? У цябе цяпер маленькі агародчык, на які можаш сабе глядзець.

Падсунула ложак хворай бліжэй да акна, каб дзяўчынка магла глядзець на прарастаючы гарох, і пайшла на работу.

— Мама, мне здаецца, што я папраўлюся, — сказала дзяўчынка вечарам. — Сонца грэла мяне сягоньня моцна.

Гарох так добранька прарастае, і я напэўна таксама паправлюся, устану і выйду на сонейка.

– Каб-жа так было, – сказала маці.

Хаця яна невялікую мела надзею, але падперла палачкай гарох, які абудзіў у дзяўчынкі столькі радасных думак. Яна не хацела, каб яго вецер зламаў. Канец ніткі прывязала да падаконьніка, а другі да верхняй часткі аконнай рамы, каб парасткі гароху мелі на што абаперціся, падымаючыся ўгару. Відаць было, як гарох разьвіваецца з кажным днём.

– Запраўды цьвіце! – сказала аднаго раньня жанчына, і мільганула ёй надзея, што хворая дзяўчынка паправіцца. Яна прыкмеціла, што ў вапошні час дзіця ажывілася. Больш гаварыла, само садзілася на ложку і бліскучымі вачыма глядзела на маленькі агародчык, які вырас з аднаго зярнятка гароху.

Праз тыдзень хворая дзяўчынка першы раз устала на гадзіну з ложка. Шчасьлівая яна сядзела ў праменьнях цёплага сонца. Акно было адчынена, праз яго зазірала ў пакой ружовая кветка гароху. Дзяўчынка пахілілася і пацалавала асьцярожна далікатныя пялёсткі. Гэты дзень быў запраўдным сьвятам.

III.

А што здарылася з іншымі зярняткамі?

Тое, што паляцела ў далёкі сьвет і крычала: – Хай мяне хапае той, хто можа! – упала ў рынну на даху і трапіла ў жывот голуба.

Два лянівыя зярняткі таксама глынуў голуб. Прынамсі яны на нешта прыдаліся.

А чацьвертае зярнятка – тое, якое хацела трапіць на

сонца, упала ў капеж. Яно там ляжала доўгія дні і тыдні ў стаячай вадзе і брыняла.

– Я пагрубела даволі, – сказала зярнятка. – Лопну! Такі лёс ня сустрэў, бадай, ніводнага зярнятка гароху. Я найбольш нязвычайнае з усіх пяці зярнятак у струку.

Капеж згаджаўся з ім.

Ля акна ў пакоіку на падстрэшшы стаяла дзяўчынка з бліскучымі вачыма і здаровымі, румянымі шчочкамі.

---

1. Каторае зярнятка вам здаецца найбольш нязвычайным? Чаму?

Слоўнічак:

Кнопка – button, knob.
Бадзёры – bold, cheerful.
Нас неўзабаве адчыняць – they will open us soon.
У ясных праменьнях сонца – in bright rays of sun.
На дзіцячай далоні – on the child's palm.
Набоі (да стрэльбы) – shells (for a gun)
Дзе-б мы не апынуліся – wherever we find ourselves.
Шчыліна, запоўнеая мохам – crack filled with moss.
Дужая – strong.
Ахвотная да работы – willing to work.
Жыла ў нястачы – she lived in poverty.
Цярпліва – patiently.
Яна мела невялікую надзею – she had little hope.
Зярнятка брыняла – the little grain has swollen.
Такі лёс ня сустрэў... – such fate didn't meet...
Капеж – gutter pipe.
Румяныя шчочкі – rosy cheeks.

МІЛЫ ГНОМ, ДЗЕ ТВОЙ ДОМ?



А. Стагановіч

Бабка баіла Алесю:
Гномаў шмат жыве ў лесе.
Маюць цёплыя капоты,
У чырвоных ходзяць ботах
І каптурыках чырвоных.
З мілых тварыкаў натхнёных
Па грудзях плывуць бародкі.
Колькі-ж дабраты салодкай
Маюць у вачах блакітных!
З вякоў даўных, старажытных
Да сягоньня жывуць гномы
І ня робяць зла нікому.
Вось каб з гномамі сустрэцца!
Алесь марыць, мараць дзеці...
Давялося раз Алесю
Пабываць улетку ў лесе.

Углядаецца кругом –
Мо' дзе прытаіўся гном?
Мо' дзе глянуць з-пад лісточка
Ясныя малыя вочкі?
Адазьвіся, мілы гном,
Дзе жывеш ты, дзе твой дом?
І няўцям яшчэ малому,
Што ў казках жывуць гномы.

В. Швед

Слоўнічак:

Гном – forest dwarf.
Каптурык – a hood.
Блакітныя вочы – blue eyes.
Алесь марыць – Ales is dreaming.
Няўцям яму – he doesn't understand...
Казка – fairy tale.

СПРАВЯДЛІВАЕ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ПРАЦЫ

Мама ідзе заўтра на работу ў новую фабрыку.

– Як я рада, што і я змагу падзарабіць, памагчы табе, – кажа яна бацьку. – Толькі што будзе з хатняй гаспадаркай? Як дамо сабе рады?

– Не клапаціся, мама, – сказаў Стась. – Я і Рая паможам маме.

– А я? – пішчыць Рэня.

– І ты таксама, – адказала Рая, – табе ўжо восем год.

Раніцаю адарваўся ў Рэні гузік ад сукенкі.

– Рая, – кажа яна старшай сястры, – гузік у мяне адарваўся.

Рая якраз рыхтавала сьнеданьне для іх усіх.

— Ну, дык прышый, — сказала. — Вось тут іголка і нітка. Што за штука прышыць гузік!

А Стась, які якраз канчаў прасаваць свае порткі, тольκі гукнуў: — Да работы, трэцяклясьніца, да работы!

Першыя дні бяз мамы былі для Рэні вельмі цяжкія. Але Рэня пастанавіла запраўды памагаць дома, так як старшыя брат і сястра.

Яна ня толькі сама прышывала сабе гузікі і цыравала сабе панчохі, але таксама ахвотна бегала купляць у краму.

— Рэня, налі мне чаю, — казала няраз мама, вярнуўшыся з работы. І Рэня зараз бегла ў кухню, каб услужыць маме.

— Добрых маю памочнікаў — цешыцца мама, а Стась кажа:

— Праўда, мама, што цяпер у нас дома работа разьмеркавана справядліва? Кажны мае свае абавязкі.

---

1. Якія абавязкі навучылася выконваць малая Рэня?
2. Якія абавязкі ўзяла на сябе ейная сястра Рая?
3. А што рабіў Стась?

Слоўнічак:

Справядлівае — just.
Падзарабіць — to earn a little money.
Зарабляць — to earn.
Хатняя гаспадарка — a household.
Не клапаціся! — Don't worry!
Рэня пастанавіла — Renia decided.
Ахвотна бегала — willingly used to run...
Абавязкі — Duties.

ПІЛНАВАЛА ГАНУЛЯ МАЛАКО Ў КАСТРУЛІ

Мама просіць Ганулю:
– Выйду я на сяло,
Ты пілнуй, каб з каструлі
Малако не ўцякло.

– Добра, – кажа дачуся, –
Ты спакойная будзь.
І бяжыць за мамусяй
На ключ дзьверы замкнуць.

Села тут пад дзьвярыма
Малако сьцерагчы.
Вось цяпер немагчыма,
Каб змагло уцячы.

Мама ўжо на парозе
Крычыць: – Ах, Божа мой,
Малако на падлозе
Разьлілося ракой.

– Ня журыся, сказала
Ганя маме ў дакор.
– Каб я не пілнавала,
Уцякло-б і на двор.

В. Швед

ДВА МАРОЗЫ

(Народная казка)

I.

Гулялі па чыстым полі два марозы, два родныя браты – мароз Чырвоны-Нос ды мароз Сіні-Нос; з нагі на нагу паскоквалі, рукою аб руку пастуквалі.

Вось пачулі яны з аднаго боку званочак, а з другога бубенчык: са званочкам пан едзе, а з бубенчыкам – мужычок. Мароз Чырвоны-Нос, які быў маладзейшы, кажа:

– Мне лепш-бы за мужычком пабегчы, я яго хутчэй дайму: кажух у яго, мабыць, стары, палатаны, шапка ўся ў дзірках, на нагах адны лапцікі. А ты ўжо, братка, як дужэйшы за мяне, за панам бяжы. На ім, пэўна, хутра мядзьведжае, шапка лісава, боты воўчыя.

– Добра, – кажа мароз Сіні-Нос.

Абодва сьвіснулі, трэснулі, пабеглі.

II.

Вось праз поўгадзіны зышліся яны зноў у чыстым полі. Старэйшы кажа:

– Я так замарозіў свайго пана, што ён гадзіну будзе грэцца – не адагрэецца.

– А як-жа хутра, ды шапка, ды боты?

– Не памаглі. Забраўся я да яго і ў хутра, і ў шапку, і ў боты, ды як пачаў марозіць. А ён гнецца, захінаецца й думае: "Давай я ніводным суставам не паварушу, можа мяне мароз і не замарозіць". А мне гэта і на руку. Як узяўся я за яго, ледзь жывога з павозкі выпусьціў.

III.

– А мой мужык мяне ледзь не забіў – скардзіцца малодшы. – Дарогаю пачаў быў я даймаць яго, а яму і бяды мала. Прыехаў ён на месца й узяўся за сякеру. Я да яго пад кажух, давай яго марозіць. А ён сабе сякераю махае, толькі шчэпкі кругом ляцяць. Пачаў нават пот яго прабіраць. Я прэч адскочыў. Думаю: "Што рабіць?" А мужык усё працуе ды працуе: стала яму зусім горача. Гляджу – ськідае з сябе кажух, а кажух дык зусім мокры. Узрадаваўся я, залез у кажух ды замарозіў яго так, што зрабіўся ён, як лубяны. Скончыў мужык сваю работу, падыйшоў да кажуха, выбраў палена доўгае ды як пачаў па кажуху біць. Па кажуху б'е, а мяне ўсё лае. Мне-б уцякаць хутчэй, але вельмі-ж я ў воўне ўвяз, выбрацца не магу. А ён усё лупіць, а ён усё лупіць. Ледзь я ўцёк. Думаў касьцей не зьбяру. Да гэтага часу бакі ныюць.

1. Чаму мароз Сіні-Нос пайшоў маразіць пана, а мароз Чырвоны-Нос мужыка?
2. Чаму ім удалося замарозіць пана?
3. А чаму яны не маглі нічога зрабіць мужыку?

Слоўнічак:

Бубенчык – a little drum.
Мужык, мужычок – селянін, a peasant.
Кажух – a sheepskin coat.
Лапці, лапцікі – bast moccasins.
Футра – fur coat.
Сякера – an axe.
Палена – a log.
Ён мяне лае – he is scolding me.
Я ўвяз у воўне – I got stuck in the wool.

ЁЛКА

Гэй ты, ёлачка, сьвятлей
Заблішчы агнямі!
Запрасілі мы гасьцей
Весяліцца з намі.

Па дарожках, па сьнягах,
Па лясных лужайках
Прыскакаў на сьвята к нам
Доўгавухі зайка.

А за ім – глядзіце ўсе –
Рыжая лісіца:
Захацелася лісе
З намі весяліцца.

Вось прышоў к нам на Каляды
Касалапы Мішка.
Ён прынёс з сабою мёд,
Залатую шышку.

Гэй ты, ёлачка, сьвятлей
Заблішчы агнямі,
Каб аж лапы у зьвяроў
Заскакалі самі.

ЛЮБІШ КАТАЦЦА – ЛЮБІ САНАЧКІ ВАЗІЦЬ

Як віхор, на санках з горкі
Паляцеў уніз Рыгорка.
Эх, і слаўна!
Хлопчык рад.
Толькі як цяпер назад?
Санкі ўгору не бягуць,
А ня хочацца цягнуць...

Ён да мамы – папытацца,
Як яму, Рыгорку, быць.
– Калі любіш сам катацца –
Любі й саначкі вазіць.

Іван Шуцько

М Е Н С К

Менск – сталіца нашай бацькаўшчыны Беларусі.

Менск вельмі стары горад. У 1967 годзе Менск сьвяткаваў дзевяцьсот год свайго існаваньня.

У вапошнюю вайну Менск, як і шмат іншых старых гарадоў у Эўропе, быў моцна зьнішчаны нашымі ворагамі.

Адразу пасьля аднак заканчэньня вайны пачалося аднаўленьне Менску. Працавалі людзі старанна, не шкадавалі сваіх сілаў. На папялішчах і руінах вырасьлі вялікія мадэрныя дамы, былі пракладзеныя шырокія вуліцы. Абапал іх пасаджаныя дрэвы, кветкі.

Шмат яшчэ новых дамоў будуецца. Дзень і ноч кіпіць работа на будоўлях гораду.

На ўскраінах Менску стаяць вялікія заводы: трактарны, аўтамабільны, матацыклявы. Вакол заводаў пабудаваныя новыя селішчы.

Для дзяцей у Менску, апрача школаў, ёсьць тэатр маладога гледача, дзіцячы кінотэатр, спартовыя школы і найцікавейшае – дзіцячая чыгунка.

На гэтай чыгунцы дзеці ня толькі пасажырамі, але і чыгуначнікамі.

У Менску ёсьць і дзіцячы экскурсыйна-турыстычны асяродак. Штогоду тут бываюць тысячы школьнікаў з усяе Беларусі.

---

1. Напішы, якія заводы ёсьць у Менску.
2. Што пабудавана ў Менску адмыслова для дзяцей?
3. Што ёсьць адмысловага для дзяцей у горадзе, дзе вы жывяце?

Слоўнічак:

Сталіца – the capital city.
Бацькаўшчына – the Fatherland.
Сьвяткаваць – to celebrate.
900-годзьдзе свайго існаваньня – 900 years of its existence.
Быў зьнішчаны – was destroyed.
Ворагі – enemies.
Старанна – conscientiously.
Папялішча – месца,дзе толькі попел застаўся
Попел – ashes.
Аба́пал вуліцы – On both sides of the street.
На ўскраінах Менску –in the outskirts of Miensk.
Заводы – factories, plants.
Тэатр маладога гледача – theater of the young spectator..
Чыгунка – railroad.
Турыстычны асяродак – a tourist center.

МЕНСК

Горад мой вячысты,
Горад прамяністы,
Вечна працавіты,
Вечна урачысты!

Днямі і начамі
Ты шуміш гудкамі,
Сьвецішся далёка
Белымі агнямі.

І над цэлым сьветам
Пурпуровым цьветам
У садох і парках
Зацьвітаеш летам.

П. Глебка

МАЛЫЯ ЧЫГУНАЧНІКІ

На станцыі дзіцячай чыгункі ў Менску мітусьня. Неўзабаве адыходзіць цягнік. Сьпяшаюцца малыя пасажыры. У касіркі – пяціклясьніцы Каці шмат работы.

– Каця, адзін білет!

– Каця, два білеты!

– Каця, чаму аддаеш мне назад грошы? – пытаецца нейкі малыш, які не разумее, што атрымаў рэшту.

Ой, павінна Каця ўважаць, каб у такой мітусьні не памыліцца. Каб выдаваць адпаведныя білеты, каб браць якраз столькі грошай, колькі трэба – ні зашмат, ні замала. Дык яна робіць усё ўважліва. Так уважліва, што аж лоб зморшчыла.

У суседнім пакоі сядзіць ля тэлефону дзяжурны станцыі – Алесь. Ён дзяржыць трохі завялікую трубку і заклапочана выклікае начальніка суседняй станцыі, Барыса:

– Галё, Барыс! Ты чуеш мяне?... Праз пяць мінут пушчаю цягнік. Ці дарога вольная? Напэўна не занятая?

Скончыўшы гутарку Алесь выходзіць на пэрон. Пасажыры пазаймалі ўжо месцы. Толькі некалькі, што спазь-

ніліся, бегаюць яшчэ ад вагона да вагона.

– Садзіцца, садзіцца! – крычаць кандуктары.

Малы машыністы высоўваецца з паравозу:

– Можна ехаць? – пытаецца ён Алеся.

Алесь круціць галавою.

– Пачакай, яшчэ дзьве мінуты. Ты хочаш ужо ехаць, а яшчэ-ж ня ўсе селі ў вагоны!

Нарэшце кандуктар зачыніў дзьверы вагону за апошнім сьпешна ўваходзячым малышом. Алесь пазірае на гадзіньнік: яшчэ поўмінуты! Ён хутка праходзіць уздоўж цягніка, правярае, ці ніхто не застаўся на пэроне. Акрамя дзяжурных, няма нікога. Падымае сьцяжок:

– Гатоў! – гукае ён голасна.

– Гатоў! – паўтараюць кандуктары.

Усё хутчэй пачынаюць грукацець колы па зялезных рэйках. Алесь хвіліну прыслухоўваецца да іх роўнамернага стуку:

– Тук-тук-так... тук-тук-так...

За шыбамі вагонаў мільгаюць вясёлыя твары дзяцей.

– Усё ў парадку! – сьцьвярджае здаволены Алесь і ўсьміхаецца.

– Усё ў парадку! – кажа сама да сябе малая касірка Каця.

Грошай у касе якраз столькі, колькі быць павінна. Ні зашмат, ні замала. Маршчынка павагі прапала бяз сьледу. Каця мае ахвоту пагуляць.

– Алесь! Даганяй мяне! – гукае яна на праходзячага дзяжурнага.

Але даганяць яе бярэцца ня толькі Алесь. Бяжыць і Андрэй – начальнік станцыі, – і Валя – тэлефаністка, і Язэп – кантралёр білетаў.

Да адыходу наступнага цягніка яшчэ тры гадзіны. Можна крыху пагуляць!

1. Кім была Каця? Чаму яна мусіла моцна ўважаць?
2. Якія абавязкі дзяжурнага на станцыі? Якія абавязкі кандуктараў?
3. Хто кіруе цягнік?
4. Ці ты хацеў-бы працаваць на такой чыгунцы, і кім?

Слоўнічак:

Чыгунка — railroad.
Чыгуначнікі — railroad workers.
Цягнік — a train.
Атрымаў рэшту — he got his change (in money)
Павінна ўважаць — she has to pay attention.
Дзяжурны — person "on duty"
Заклапочана (пытаецца) — He's asking worriedly...
Гутарка — conversation.
Паравоз — locomotive.
Сьцяг, сьцяжок — flag.
Паўтараць — to repeat.
Зялезныя рэйкі — iron rails.
Шыбы — window panes.
Здаволены — satisfied.
Моршчынка — a wrinkle.
Павага — seriousness.
Паважны — serious.
Абавязкі — duties.

ЦЯГНІК

Паравоз сьвіснуў, павольна рушыў і сказаў вагонам:
— Ух, як ця-а-жка! Ух, як ця-а-жка! Ух, як ця-а-жка!
А вагоны яму ў вадказ:
— Ну, дык што-ж! Ну, дык што-ж!
Прыбавіў паравоз ходу, разагрэўся, і пачаў выбіваць:
— Ух, горача стала! Ух, горача стала! Ух, горача стала!
А вагоны толькі сярдзіта застукалі:

А. Стагановіч



– Нам якая справа? Нам якая справа? Нам якая справа?
Узьехаў паравоз на мост і застагнаў:
– Ой, як страшна! Ой, як страшна! Ой, як страшна!
Прайшла небясьпека, і ён зашаптаў:
– Ах, як добра! Ах, як добра! Ах, як добра!
А вагоны ў вадказ:
– Даўно-б так! Даўно-б так! Даўно-б так!

Навучэцеся выразна чытаць апавяданьне. Пастарайцеся, каб ваша чытаньне было падобнае да стуку вагонаў і паравозу. (Адзін вучань чытае словы аўтара, другі – словы паравозу, а некалькі вучняў – словы вагонаў.)

Слоўнічак:

Паравоз – locomotive.
Сярдзіта – angrily.
Небясьпека – danger.

НОВЫ ДОМ

Вырас дом на плошчы новы,
Не малы — шматпавярховы.
Вокны ў сонцы зіхацяць,
Адусюль ён нам відаць.
Добра жыць у доме тым
І дарослым і малым!
Ліфт цябе і ўніз і ўверх —
На любы вязе паверх;
А ў кватэрах — зазірні:
Электрычныя агні,
Радыё, вадаправод —
І ніякіх вам турбот!
Маня, Коля, Ясь, Масей —
Многа ў ім жыве дзяцей!
Мы таксама ў гэтым годзе
Жыць у дом той пераходзім.

Іван Шуцько

---

1. Які дом пабудавалі на плошчы?
2. Чаму дзецям і дарослым добра жыць у тым доме?

Слоўнічак:

Шматпавярховы дом — house with many stories.
Паверх — floor, story (in a house).
Ліфт — elevator.
Турботы — troubles, cares.
Плошча — a square (in the city)

ЯКРАЗ ТАМУ

Малы, скорчаны каток ціснуўся да плоту і жаласна мяўкаў. Вялікі, руды сабака кідаўся на яго, заядла брэ-

шучы. Побач на лаўцы сядзелі два хлапцы. Яны прыглядаліся, як вялікі сабака нападае на малога ката, і чакалі, што з гэтага будзе. З суседняй хаты выйшла жанчына. Яна разгледзілася, падыйшла да плоту, адагнала сабаку й крыкнула на хлапцоў:

– Саромеліся-б!

– Чаго мы будзем саромецца? Мы-ж нічога не зрабілі.

– Якраз таму, – сказала раззлаваная жанчына.

---

1. За што жанчына сароміла хлапцоў?
2. Ці ты калі бараніў слабейшага? Раскажы, каго ты бараніў і як.

Слоўнічак:

Руды сабака – a brown dog.
Суседняя хата – neighboring house.
Саромецца – to be ashamed.

ЗІМЕ КАНЕЦ

"Пара, пара! – крычаць вароны на стрэхах. – Пара зіме адыходзіць."

"Так, так, так!" – зьвіняць па лужынах кроплі са стрэхаў.

Дзеці сьпяваюць: "Сонейка, сонца, заглянь у ваконца!"

Верабей крычыць: "Жыў-жыў!" А сінічкі: "Ськінь каптан!"

Каля шпакоўні кружацца шпакі. Скок туды, скок сюды. Селі на дошчачку, у галак пытаюцца: "Як зіму перазімавалі?"

"Так сабе, так сабе", – адказваюць галкі.

"Ура! – крычаць вароны: – зіме канец."

КОЦІКІ ВЯРБОВЫЯ



А. Стагановіч

Янка выйшаў з хаты,
Сяньня мамы сьвята.
З чым-жа я вярнуся
Віншаваць мамусю?
Стары дзядзька Яраслаў
Вось якую раду даў:
На вярбе шмат коцікаў,
Жоўценькіх жывоцікаў.
Трэба толькі іх сабраць,
З імі маму віншаваць.
Хутка наш малы герой
Апынуўся пад вярбой.
Дзе-ж мае вы коцікі,
Жоўтыя жывоцікі?
Дзе вас, коцікі, шукаць,

Як мне маму прывітаць?
Сьмяюцца дзяўчынкі:
Глянь – вось на галінках
Жоўтыя, пуховыя
Коцікі вярбовыя

В. Швед

Слоўнічак:

Віншаваць некага – to congratulate someone.
Вярба – a willow-tree.

АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА

Алесі купілі новенькія чаравікі – бліскучыя, са шнуркамі. Гэтыя чаравікі шылі на тэй абутковай фабрыцы, дзе працуе ейная мама.

Чаравікі вельмі спадабаліся Алесі, і яна папыталася ў маці:

– Няўжо ты сама шыла?

– Гэтыя чаравікі шыла шмат людзей, – адказала мама. – Мая работа толькі кроіць. Іншыя работніцы дзірачкі прабіваюць. Прабіваюць іх машынай, бо рукамі занадта марудна. А іншыя пракладку прышываюць, абцасы прыбіваюць. І таксама ўсё машынамі.

– Цікава, як гэта машынамі чаравікі шыюць, – сказала Алеся. – Можна паглядзець?

– Калі ласка, прыходзьце да нас усёй клясай на экскурсію, пабачыце, – адказала мама.

---

1. Дзе былі зробленыя Алесіны чаравікі?
2. Раскажэце, як шыюцца чаравікі.

Слоўнічак:

Абутак — shoes, footwear.
Марудна — slowly.
Абцасы — heels.

НА ТКАЦКАЙ ФАБРЫЦЫ



I.

Галя часта прасіла сваю маму:

— Вазьмі мяне з сабою на работу.

Аднойчы мама раней, як звычайна, забрала Галю з дзіцячага саду, і яны паехалі трамваем на фабрыку.

Выйшаўшы з трамваю, мама і Галя перайшлі вуліцу. Тут, у зелені дрэў, стаяў вялікі чырвоны будынак.

— Што гэта? — папыталася Галя.

— Гэта, дачушка, фабрыка, дзе я працую, — сказала

мама. – Зараз мы пойдзем з табой у цэх, і я табе ўсё пакажу.

II.

Калі яны ўвайшлі ў цэх, Галя спачатку спалохалася. Яна ніколі яшчэ ня бачыла такіх вялізных пакояў са шкляной страхой.

Усюды радамі стаялі станкі. Усе яны так шумелі і стукалі, што нічога нельга было пачуць.

Маці падвяла дачку да аднаго станка. Тут Галя раптам убачыла, што з яго шырокай доўгай стужкай цягнулася рознаколерная тканіна.

– Вось тут [redacted] і працую, – пачула Галя праз шум маміны словы. – Мы робім тут тканіну, з якой потым шыюць дзецям прыгожае адзеньне.

---

1. Дзе працавала Галіна мама?
2. Што бачыла Галя на фабрыцы? Прачытайце.

Слоўнічак:

Ткаць – to weave
Тканіна – woven fabric.

Станок – weaving loom.

КАРЫСНАЯ ЖЫВЕЛА

– Адгадайце, дзеці, загадку, – сказаў бацька:

– "Ходзіць па лугу, і заўсёды ў кажуху".

Дзеці задумаліся, а потым старэйшы хлопчык Кастусь кажа:

– Гэта авечка. Яна дае нам аўчыны на кажух.



— Правільна, — сказаў бацька. — Але ня толькі аўчыны дае нам авечка. З яе воўны робяць сукно, валёнкі, хусткі ды іншыя рэчы.

---

1. Якую загадку даў бацька дзецям?
2. Хто адгадаў загадку?
3. Чаму авечку называюць карыснай жывёлай?
4. Назаві ўсе хатнія карысныя жывёлы!

Слоўнічак:

Карысная жывёла — a useful animal.
Авечка — a sheep.
Сукно — broadcloth
Валёнкі — felt boots.
Воўна — wool.

САНІТАР (Апавяданьне жаўнера)

Быў [redacted] ранены ў нагу.
Ноч. Ляжу [redacted] ў полі. Піць вельмі хочацца. Бачу : далёка

мільгаюць агеньчыкі. Зразумеў я, што гэта нашыя санітары. Толькі далёка яны ад мяне.

"Ня знойдуць", падумаў я.

Раптам бачу, нехта бяжыць па полі. Усё бліжэй ды бліжэй... Сабака... Наш сабака-санітар !

Падбег ён да мяне, бок падстаўляе. На баку ў яго торба вісіць, а з торбы баклажка відаць. Узяў я баклажку, выпіў вады. Адразу лепш стала. Дастаў я з торбы бінт, перавязаў, як умеў, сваю рану. А сабака схапіў у зубы палачку, што вісела ў яго на ашыйніку, і пабег.

Хутка сабака вярнуўся з санітарамі. Санітары забралі мяне ў шпіталь.

Як-жа даведаліся санітары, што сабака знайшоў ранене-нага? Вельмі проста: па палачцы. Калі сабака вярнуўся з абходу з палачкай у зубах, значыць ён некага знайшоў. Так яго навучылі.

Сабак-санітараў вучаць у вадмысловых школах. Цэлыя тры месяцы вучаць іх, як трэба шукаць раненых у час бою.

Такіх сабак называюць санітарамі. Яны не баяцца стрэлаў, і чужы чалавек не саб'е іх з дарогі. Сабакі-санітары ратуюць на вайне нямала людзей.

---

1. Як быў выратаваны ранены?
2. Дзе і як вучаць сабак быць санітарамі?
3. Якую карысьць прыносіць чалавеку сабака?

Слоўнічак:

Ранены — wounded.
Рана — a wound.
Бінт — bandage.
Адмысловая школа — a special school.
Ратаваць — to save.

ПАЖАРНЫЯ САБАКІ



Аднаго разу загарэўся дом. Калі пажарнікі прыехалі пад дом, насустрач ім выбегла жанчына. Яна плакала й казала, што ў доме засталася двухгадовая дзяўчынка.

Пажарнікі паслалі сабаку Бобіка. Бобік пабег па сходах і зьнік у дыме.

Праз пяць мінут ён выбег з дому, і ў зубах за кашульку нёс дзяўчынку.

Маці кінулася да дачкі і плакала ад радасьці, што дачка была жывая.

Пажарнікі лашчылі сабаку і аглядалі яго – ці не абгарэў ён, але Бобік кідаўся зноў у дом. Пажарнікі думалі, што ў доме яшчэ засталося нешта жывое, і пусьцілі яго. Сабака пабег у дом і хутка выбег з чымсьці ў зубах.

Калі народ разгледзеў тое, што ён нёс, то ўсе пачалі сьмяяцца – ён нёс вялікую ляльку.

Л. Талстой

---

1. Што здарылася ў часе пажару?
2. Што зрабіў Бобік, калі вынес дзяўчынку?

Слоўнічак:

Зьнік у дыме — disappeared in smoke.
Лашчылі сабаку — they petted the dog.

НАВУКА І КАТОК



А. Стагановіч

З ілба рукой змахнуўшы пот,
Сынок зьвяртаецца да маці:
— Чаму спакойна дрэмле кот,
А я штодзень працую ў хаце?

Ня вытрымаў малы каток
І мяўканьнем адказ даў Грышу:
— Я навучуся, мой сынок,
Ты за мяне паловіш мышы!

Шмат часу Грыша – мышалоў
Нёс варту над мышынай норкай.
Спазнаў: я горшы ад катоў, –
І ледзь-ледзь не заплакаў горка.

З тых пор ён разважае так:
– Мне ленавацца больш ня трэба.
Малы каток і той аднак
Працуе на кавалак хлеба.

В. Швед

ВОЖЫК

Выбраў сабе вожык пад дрэвам норку. Добрая норка, толькі пасьцелі няма. Пабег ён пасьцель шукаць.

Знайшоў кучу лісьцяў і давай па іх качацца. Накалоліся лісты на ягоныя іголкі, і панёс іх вожык у сваю норку.

Потым зноў выбег якой-небудзь ежы здабыць. Злавіў жука і зьеў. Ды мала яму жука. Добра было-б мышку знайсьці. Ідзе ён між соснамі, прыслухоўваецца.

Здалёку пачуў лісу, згарнуўся ў клубок і прыціх.

Выскачыла ліса, бегае вакол калючага клубочка, а схапіць ня можа. Вожык чмыхае, лісу пужае. Але не баіцца хітрая ліса. Пакаціла яна вожыка да рэчкі. Там вожык у вадзе разгорнецца. Але забрахалі блізка сабакі. Насьцярожылася ліса. Чуе, па дарозе нехта едзе. Кінула яна вожыка і пабегла.

---

1. Хто з вас бачыў вожыка? Раскажэце, які ён.
2. Чым жывіцца вожык?
3. Якія ворагі ў вожыка?

Вожык – porcupine.
Сосны – pine-trees.

ЗАГАДКА

Хоць малы ён – часам з кулак, але ў рукі ня возьмеш ніяк.

ВОЖЫК І КОТ

Я дадому ўчора
Ўвечары ішла,
На сьцяжынцы ў садзе
Вожыка знайшла.

Як мяне ўбачыў
Хітранькі зьвярок,
Раз! схаваў ён рыльца,
Зьвіўся у клубок.

Вострыя іголкі,
Як тыя штыкі,
Натапырыў спрытна
Ў розныя бакі.

– А ну, хто ахвочы –
Падыходзь, герой!
Нас, браток, ня возьмеш
Голаю рукой.

Я яго хусьцінкай
Ціхенька ўзяла.
Дадому прынесла,
Сама спаць пайшла.

Раніцай прачнуўся
Мой пястун-каток,
Бачыць: што такое –
Мячык, ці клубок?

Бачыць і ня верыць
Ён сваім вачам:
Як жывы, за ложак
Скокнуў мячык сам.

Коцік яму лапкай
Калі дасьць у бок!
Ой-жа, як балюча
Колецца клубок!

– Вось табе за гэта! –
Стукнуў коцік зноў,
І яшчэ балючай
Лапкі накалоў.

Запішчаў тут коцік
Жаласна: ”Мяў, мяў,
Гэтакіх клубочкаў
Я ня сустракаў!”

А. Жаўрук і А. Ушакоў

ВАЎКІ

Мой дзед быў лясьніком. Раз ішоў ён дамоў лесам. Сьцямнела. Раптам дзед пачуў — выюць ваўкі. Ён пайшоў хутчэй, але выцьцё ўсё набліжалася. Дзед пайшоў па дарозе. Агляднуўся. Бачыць — недалёка бліскучыя кропкі. Вось ён чуе, як ваўкі ляскаюць зубамі.



Дабег дзед да высокай елкі і ўскочыў на ніжні сук. Ваўкі ўбачылі яго на дрэве і спыніліся. Некалькі ваўкоў сталі на заднія лапы каля дрэва. Дзед узьлез яшчэ вышэй. Ваўкі вылі ды скраблі лапамі кару елкі.

Ноч ужо даўно надыйшла. Дзед зразумеў, што яму тут давядзецца правесьці ўсю ноч. Забраўся ён вышэй і ўсеўся на сук.

Наляцеў вецер, галіны елкі закалыхаліся, і ў дзеда зьляцела шапка. Ваўкі падхапілі яе і разьдзерлі.



Ваўкі сядзелі пад дрэвам і вылі. Дзед моцна трымаўся за сукі, а елка калыхалася і гнулася ад ветру.

Так сядзеў ён усю ноч.

Раніцаю зьніклі ваўкі. Дзед зьлез з дрэва і пайшоў дамоў.

---

1. Як сустрэўся дзед з ваўкамі?
2. Куды ён ад іх схаваўся?
3. Што рабілі ваўкі?
4. Колькі часу праседзеў дзед на дрэве?

Слоўнічак:

Лясьнік — a forester.
Ваўкі выюць — wolves are howling.
Сук — knot (on a tree)
Кара́ дрэва — bark

МЯДЗЬВЕДЗІЦА

Нарадзіліся ў мядзьведзіцы дзеці — маленькія, сьляпыя, як кацяняты. Трошкі падрасьлі мядзьведзікі, і маці пачала вадзіць іх на паляваньне разам з большымі сваімі дзецьмі, якія каля маткі кормяцца да трох гадоў.

Вось пачало сьвітаць, і мядзьведзіца павяла іх па лесе. Ішлі яны не сьпяшаючыся, спыняліся каля кажнага пня, пераварочвалі кажны сучок, кажны камень. Маці паказвала малым дзеткам, як здабываць ежу.

Адвярнула яна камень, прыдушыла лапай жучка і зьела яго. Злавіла матылька і аддала яго мядзьведзікам. Колькі тут было радасьці! Матылёк трапечацца, а яны гуляюць з ім, пакуль не зьядуць. Вось знайшлі суніцу — смачная ягадка. Там трапіўся мурашнік. Мядзьведзіца раскапала яго, і яны пачалі есьці мурашчыныя яечкі.

1. Чым карміла мядзьведзіца малых мядзьведзікаў?
2. Дзе яны шукалі пажывы?

Слоўнічак:

Мядзьведзіца — a she-bear.
Паляваньне — the hunt.
Паляваць — to hunt.
Пачало сьвітаць — It began to dawn.
Спыняліся каля пня — they stopped near a tree-stump.
Лапа — a paw.
Матылёк — a butterfly.
Суніца — a strawberry.
Мурашнік — ant-hill.
Мурашкі — ants.

ЛЕЎ І САБАЧКА



У вадным зьвярынцы ў зялезнай клетцы сядзеў леў. Раз кінулі яму на абед маленькага сабачку. Сабачка са страху прыціснуўся ў куток клеткі. Леў панюхаў яго. Сабачка лёг на сьпіну і падняў лапкі. Леў дакрануўся да яго лапай. Сабачка ўсхапіўся і стаў перад ільвом на заднія лапкі. Леў глядзеў на сабачку і не чапаў яго. З таго часу сабачка жыў у ваднэй клетцы з ільвом.

Калі ільву прыносілі мяса, ён дзяліўся з сабачкам.

Калі ён спаў, сабачка клаўся каля яго ды клаў сваю галаву яму на лапу. Удзень леў часта гуляў з ім.

Так пражылі яны цэлы год.

Але вось сабачка захварэў і здох. Леў перастаў есьці, усё абнюхваў яго, лізаў і дакранаўся лапай.

Калі леў зразумеў, што сабачка мёртвы, ён стаў біць сябе хвастом, кінуўся на зялезныя краты і пачаў грызьці іх. Цэлы дзень ён кідаўся па клетцы і роў.

Потым ён лёг каля мёртвага сабачкі, абняў яго лапамі і сьціх. Так праляжаў ён пяць дзён.

На шосты дзень леў здох.

Л. Талстой.

---

1. Як падружыўся леў з сабачкам?
2. Як яны жылі ў клетцы?
3. Што здарылася з ільвом, калі сабачка здох?

Слоўнічак:

Зьвярынец — the zoo.
Лапа, лапка — a paw.
Зялезныя краты — iron bars.

ПЕВЕНЬ

Па надворку певень ходзіць,
За сабою куры водзіць
І крычыць: "Сюды! сюды!"

Як кіўне ён галавою,
Сыплюць куры чарадою —
Як адна бягуць туды.

А калі хто кур пужае,
Певень грозна загукае:
"Хто такі там? Хто такі?"

Вось у сьвіран ён падаўся.
"Кыш!" адтуль хтось адазваўся.
"Хто такі там? Хто такі?"

Певень жытам кур частуе,
Гаспадара бы ня чуе,
Кліча кур: "Сюды! сюды!"

Гаспадар мятлу хапае,
Гвалт наш певень падымае:
"Хто куды! Ой, хто куды!"

Якуб Колас

БАЛОТНАЯ ВАДА

I.

Хадзілі мы з Міхасём у лес. Ідзем назад балотам міма раўчука. Змарыліся мы. Міхась і кажа:

– Чакай, давай нап'емся. Вельмі-ж піць хочацца.

Дайшлі мы да мастка, ляглі на жываты, і давай жменямі ваду чэрпаць ды піць. Вада мутная, цёплая. Пах нейкі няпрыемны ад яе ідзе. А мы з гарачыні п'ем ды п'ем...

– Што гэта вы робіце? Хіба можна піць балотную ваду? Вы-ж захварэць можаце ад гэтай вады!

Глядзім, а гэта наш доктар шпітальны. У шпіталь ішоў і нас убачыў, а мы і ня чулі, як ён падыйшоў.

Дастаў доктар з кішані шкляначку, зачарпнуў вады і кажа:

— Хадзем са мною ў шпіталь. Я вам пакажу, што вы пілі.

II.

Прыйшлі мы ў доктарскі пакой. Там на стале медная трубка стаіць на падстаўцы.

— Гэта мікраскоп, — кажа доктар. Празь яго можна бачыць і тое, чаго простым вокам ня ўбачыш.

Доктар узяў невялічкае шкло, капнуў на яго кропельку вады са шклянкачкі. Потым паклаў шкло на падстаўку мікраскопу і накіраваў на яго трубку.

— Глядзеце, — кажа, — чаго вы з балотнай вадой наглыталіся.

Паглядзеў я праз трубку. Чаго там толькі ня было! Гэта ўжо ня кропля была, а цэлая сажалка. А ў сажалцы мноства ўсякіх чарвякоў, казюлек бегае.

—І ўсё гэта ў нас у жываце? Што-ж цяпер з намі будзе? — спалохаўся я.

А доктар кажа:

— Шчасьце ваша, што брушнога тыфу ў нас ня чуваць. А то маглі-б захварэць ад такой вады.

Мы пастанавілі больш ніколі ня піць гнілой балотнай вады.

Слоўнічак:

Балота — swamp, marsh.
Роў — a ditch.
Раўчук — a little ditch.
Няпрыемны пах — unpleasant smell.
Медная трубка — a copper tube.

Гнілы — rotten.

КУРКА ЧУБАТКА І ГУСЯНЯТКІ



А. Стагановіч

Пасадзіла цётка Майка
Курку на гусіных яйках.
Неўзабаве было шмат
Невялічкіх гусянят.
З жоўтадзюбай чарадой
Ходзіць курка над ракой.
Курка берагам ідзе,
Гусяняты ўсе ў вадзе.
І на дзіва, без канца
У ваду даюць нырца.
Гляньце, што за дзівакі,
Ня пужаюцца ракі.
Курка плача: ко-ко-кó-ко,
У рацэ да дна глыбока.
У вадзе мае малюткі

Патапіцца могуць хутка.
Ня ведае чубатка,
Што гэта гусянятки.

В. Швед

КІМ БЫЦЬ?

Запытаў я сяньня ў таткі:
– Кім, як вырасту, мне быць?
А ён мне:
– Э, не, Ігнатка,
Сам павінен ты рашыць!

Я рашыць, вядома-б рад,
Ды прафэсій вельмі шмат:
Аграномы, трактарысты,
Інжынеры, машыністы,
Землямеры, маляры,
Садаводы, пчаляры –

Іх усіх і ня зьлічыць!
Вось і думай: кім тут быць?

І. Шуцько.

Раскажы, кім ты хацеў-бы быць. Чаму?

ЕДЗЕМ ДА ЦЁТКІ

І.

Прыгожая цёплая восень.

Сёньня субота, і мы паедзем адведаць цётку і дзядзьку, якія жывуць няпоўных шэсьцьдзесят міляў ад нас.

– Паедзем, хаця палюбуемся залатой восеньню, – кажа мама. – Ня ведама, як доўга яшчэ будзе трываць та-

кое добрае надвор'е.

Але зраніцы я яшчэ маю лекцыю музыкі, павязе мяне тата.

Тата кажа маме:

– Пастарайся быць на станцыі раней. Наш аўтобус адыходзіць дзесяць мінут па дванаццатай.

А палове дванаццатай я закончыла лекцыю, а бяз чэцьверці дванаццаць мы ўжо былі на станцыі.

Мамы яшчэ няма. Ужо без пяці дванаццаць, мінае дванаццатая, і пяць мінут па дванаццатай. Тата пачынае нэрвавацца. Што сталася? Наступны аўтобус будзе толькі праз дзьве гадзіны.

Шафёр ужо пачаў упушчаць пасажыраў.

Ажно, на шчасьце, ідзе мама!

За пару хвілінаў мы забываемся на хваляваньне чаканьня. Наш аўтобус імчыць па вуліцах Торонта, а думкі мае яшчэ шпарчэй, далёка выперадзілі яго. Яны ўжо ў нашым улюбленым лесе, куды мы і заўтра, мусіць, паедзем.

---

1. Перапішы першы сказ і нарысуй цыфэрблят гадзіньніка, на якім стрэлкі паказваюць дадзеную гадзіну. І гэтак-жа зрабі з трыма наступнымі сказамі:
   а) Палова другой.
   б) Без дваццаці пяці дванаццаць.
   в) Чэцьверць па дзевятай.
   г) Бяз чэцьверці дзесяць.
2. Напішы па парадку дні тыдня.
3. Апішы ў пару сказах, як выглядае лес увосень.

Слоўнічак:

Добрае надвор'е – good weather.
Хваляваньне – nervousness

II.

Лес гэты запраўды ня наш, мы яго толькі так называем. Да яго ехаць ад цёткі ўсяго поў гадзіны часу, і таму мы вельмі часта ў ім бываем.

Аднойчы ўвесну дзядзька паказаў нам на рэчцы ў гэтым лесе бабра, які грэўся на сонцы і весела плёскаў хвастом па вадзе. Бабёр нас напэўна ня бачыў, бо мы ціхенька стаялі, прычаіўшыся за кустом.

Можа ён купаўся, бо спацеў, падгрызаючы хвойку сабе на хатку. Адно такое дрэва, мы бачылі, ляжала ў зарасьніку недалёка адсюль. Канец дрэва меў форму конуса, быццам яго нехта малымі далатцамі з бакоў да сярэдзіны абчустрыў.

Раз паехалі мы ў гэты лес узімку, хутка пасьля Каляд. Сьнегу вышэй калена, а мне з братам мясцамі па пояс.

Як цяжка было ісьці, але і як прыемна, каб толькі ня было так горача!

Але брат выбег наперад. Ён лёг сьпіною на гладзенькі сьнег, ды разводзячы адначасна рукамі й нагамі, лёгка цёр імі па сьнезе.

– Паглядзеце, што я зрабіў! – крычаў ён.

Адбітак, які ён зрабіў на сьнезе, напамінаў анёла...

Але заўтра сьнегу ня будзе.

Дарослыя, мусіць, пойдуць у дзядзькаву "плянтацыю рыжыкаў", як яны жартам празвалі адкрытую ім адзіную мясьціну ў лесе, дзе растуць грыбы рыжыкі.

Дзядзька соліць рыжыкі і на зіму. Я іх вельмі люблю, асабліва са сьмятанай.

А можа цёця пойдзе са мной дарогай да рэчкі, бо яна ня любіць хадзіць па ройстрах. Ройстрамі наш дзядзька

называе балотністы зарасьнік, праз які і тут трэба прабірацца, каб дайсьці туды, дзе растуць рыжыкі.

А найбольш мама з цёцяй любяць гэты лес. Кажуць, што тут здаецца ім, што яны ў Беларусі. Тата з дзядзькам сьмяюцца і кажуць, што гэты лес зусім не падобны да беларускага.

— У нас, — кажуць, — як лес, дык лес, падчышчаны. Няма ў ім гэткіх зарасьнікоў. Не валяецца, як тут, усякае ламачча, а то і цэлыя падгнілыя дрэвы.

На што мама адказвае:

— А для мяне абы лес, дык і Беларусь.

Мая мама з Палесься.

---

1. Каго дзеці бачылі ў лесе вясною?
2. Дзе жывуць бабры?
   Якая зь іх карысьць для людзей?
3. Папытайся ў бацькоў і напішы, скуль з бацькаўшчыны твая мама, і скуль тата.

Слоўнічак:

Бабёр — a beaver.
Па ягоных сьлядох — in his footsteps.
Падгнілыя дрэвы — half-rotten trees.

III.

А можа мы паедзем на скалы? Скалы я люблю яшчэ больш, асабліва-ж узьбірацца на іх.

Скаламі мы называем скалістыя ўзгоркі абапал дарогі, што ідзе праз рэсортную ды дачную аколіцу цудоўнай Мускокі. Парослыя лесам скалы, а між іх нязьлічоная колькасьць малых і большых азёр і рэчак.

Апошні раз мы былі там у часе мінулага Вялікадня.

Сьвяціла сонца, але дзьмуў халодны паўночны вецер. Мы стараліся грэцца, ходзячы па горах. Пазьней тата распаліў вогнішча, знайшоўшы зручнае месца для яго на зацішным схіле гары.

Пры вогнішчы мы частаваліся цётчынымі вялікоднымі прысмакамі: кумпяком з хрэнам, бабкай, мазуркамі. Нехта пачаў гутарку пра Індыянаў. Дзіўна, тут неяк усё пра іх напамінае. Глянеш на раку – так і здаецца, што ўбачыш човен з бярозавай кары, а ў ім гордага індыянскага галавара ў пышнай кароне з пёраў. А можа гэта духі тых харобрых ваякаў, што калісь да апошняга баранілі сваёй зямлі ды правоў свайго народу, наводзяць думкі аб іх?

Або тога лета, калі прыяжджалі да нас госьці з Нью-Ёрку – Ганна ды ейныя мама і тата.

Тады на скалы паехалі мы двума аўтамі: у першым мужчыны, а ў другім самыя жанчыны. І трэба-ж было, у цёціным аўце лопнула апона ў заднім коле. Мы трубілі і трубілі, але нашыя ў першым аўце нас ня чулі.

На шчасьце, скалы ў гэтым месцы не даходзілі блізка да аўтастрады. Цёця зьехала на бок, і мы затрымаліся. Мы стаялі і думалі, што рабіць.

Ажно насустрач нам едзе аўта і таксама трубіць. Гэта і былі нашыя. Яны досыць хутка агледзеліся, што мы за імі ня едзем, і завярнуліся назад шукаць нас.

Было вельмі горача, і таму, зьмяніўшы апону ў нашым аўце, мы ўсе паехалі яшчэ далей аж да ракі Мэк Дональд. Тут мы спыніліся ў малой лагчыне, блізка аўтастрады.

Скалы з нашага боку стромым абрывам апускаліся да ракі, так што нам давялося даволі далёка караскацца па горах, пакуль мы знайшлі лагодна нахілены праход да яе.

Усе пайшлі ў ваду. Дзеці плюхаліся. Дарослыя мерка-

валі плаваць, толькі мама, адыйшоўшы крыху далей ад берагу, узабралася на чуб плоскай скалы, і так стаяла. Раптам чуем мамін голас: "Глядзеце, вуж!" Хто пачуў, глянуў у ейны бок — пару цаляў ад маміных ног паўзла на камень доўгая вужака. Усе на міг анямелі, і толькі, калі вуж, можа таксама спалоханы нечаканай сустрэчай, хутка завярнуўся і нырнуў у ваду, усе охнулі. А Ганьнін тата, дзядзька Лявон, жартаваў:

— А вы, спадарыня, нават і ня віснулі. Ну гэта ўжо проста непашана да вужакі. Бачыць яе ля сваёй нагі і ня віснуць!

— Ева, глядзі, заяц пабег! — чую я татаў голас і аж здрыганулася ад нечаканасьці. Я глянула ў вакно аўтобуса — і запраўды, бедны зайчык, мусіць нечым спуджаны, з поля шмыгнуў у лес.

Калі мінем гэты лес, ужо будзе відаць гарадок, дзе жыве мая цёця, ды куды мы едзем.

---

1. У якую пару году бывае Вялікдзень? Якая пагода была на Вялікдзень, аб якім гутарка ў расказе?
2. Напішы, якія стравы прыгатаўляе твая мама на Вялікдзень?
3. Ці вы бачылі калі жывога вужа? Апішэце, дзе і як.

Слоўнічак:

Скалы — rocky hills.
Вогнішча — bonfire.
Паўночны вецер — northern wind.
Галавар — a chieftain.
Харобрыя ваякі — brave warriors.
Правы народу. — Rights of the people.
Апона — a tire.
Лагчына — a small valley.
Стромы — steep.

Лагодны — mild.
Меркавалі плаваць — they planned to swim.
Пару цаляў — a few inches.
Вуж, вужака — a snake.

НАДАКУЧЫЛА ЗІМА

Надакучыла дзецям зіма:
Ім разгону зімою няма.
Сагналі ахвоту на санках,
На лыжах, каньках і лядзянках.
Надакучыла дзецям зіма,
І чакае вясны іх гурма.

Якуб Колас

1. Растлумачце, што значыць: "няма разгону".
2. Што значыць: "сагналі ахвоту на санках"? Як гэта можна сказаць іншымі словамі?

ДНІ ЎСЕ БОЛЬШАЮЦЬ

Вясной з кажным днём сонейка на небе ўздымаецца ўсё вышэй і вышэй. З кажным днём грэе яно ўсё мацней і мацней. Ноччу яшчэ падмарожвае, са стрэхаў спускаюцца ледзяшы. Але прыгрэе сонейка, заплачуць ледзяшы і пападаюць на зямлю.

Кажны дзень адбірае сонейка ад ночы мінуту за мінутай. Узыходзіць яно трошкі раней, а заходзіць пазьней. Дні ўсё большаюць і большаюць.

І вось прыйшоў сакавік. 21 сакавіка дзень такі самы, як і ноч: дзень 12 гадзінаў і ноч 12 гадзінаў.

Улетку дні будуць доўгія, а ночы кароткія.

1. Напішы па два разы: 21 — дваццаць адзін; 12 — дванаццаць.

2. Якія зьявы паказваюць, што набліжаецца вясна?
3. Калі дзень бывае роўны ночы?
4. Калі дні становяцца даўжэйшыя за ночы?
5. Назавеце веснавыя месяцы. Запамятайце іх.
6. Адкажэце вусна, чым розьніцца вясна ад восені.

Слоўнічак:

Чым розьніцца вясна ад восені?
— Якая розьніца між вясной і восеняй?
Розьніца — difference.

ВЯСНОЙ	ВОСЕНЬНЮ
Дні большаюць.	Дні ... .
Ночы ...	Ночы ... .
Сонца пачынае прыграваць.	Сонца ... .
Траўка ...	Траўка ... .
Зьяўляюцца кветкі.	Кветкі ... .
На дрэвах ...	Лісты ... .
Птушкі ...	Птушкі ... .

Веснавыя месяцы

САКАВІК, КРАСАВІК, МАЙ (або ТРАВЕНЬ)

ПЕСЬНЯ АБ ВЯСЬНЕ

Уцякай, мароз-дзядуля!
Чуеш ты, стары, ці не?
На пагорках — булі-гулі —
Песьні чуюцца вясьне.

Звоніць, скача, як дзіцятка,
Гэты жэўжык-ручаёк.
На яго, бы тая матка,
Сонца кідае свой зрок.

А ён, гучны і сьмяшлівы,
Так і ходзіць, аж дрыжыць,
І другі сябрук шчасьлівы
Насустрэч яму бяжыць.

А зіма аж пачарнела –
Годзе ёй тут кросны ткаць!...
Гэй, маленства, жыва, сьмела
Выйдзем весну прывітаць!...

Я. Колас

---

1. Аб чым гаворыцца ў гэтым вершы?
2. З кім параўноўваюцца мароз, ручаёк і сонца? Адкажы словамі верша.
3. А што сталася з зімой?

ГРАКІ ПРЫЛЯЦЕЛІ

Першымі да нас з выраю прылятаюць гракі. Скачуць яны па дарогах, па прагалінках – чорныя, беланосыя.

Адпачнуць крыху пасьля доўгай дарогі і пачнуць гнёзды свае ладзіць.

Расьсядуцца на дрэвах, крычаць, шумяць, мітусяцца, галінкі сухія ламаюць. Адны старыя гнёзды правяць, другія новыя будуюць. Увесь дзень гракі працуюць, а ўвечары пасядуць каля сваіх гнёздаў і сьпяць да раніцы. А прачнуцца рана-рана і зноў за работу. Сьпяшаюцца гракі – пара грачыхам птушанят выводзіць. У гракоў птушаняты самыя раньнія. Не пасьпеюць на дрэвах лісты

распусьціцца, а яны ўжо крычаць — есьці просяць.

---

1. Калі да нас прылятаюць гракі?
2. Дзе робяць гракі гнёзды?
3. Калі гракі выводзяць птушанят?

Слоўнічак:

Прагалінка — месца, дзе растаяў сьнег.
Гнёзды — nests.
Адно гняздо — One nest.

ЗАГАДКА

За ўсіх птушак ён чарней, чысьціць поле ад чарвей, ён карысны як і шпак, а завецца птушка .... .

Ад чарвей — from worms
Чэрві, чарвякі — worms

ЛЕС І РУЧАЙ
(байка)

Вясёлы ручай працякаў па дрымучым лесе. Ручай быў нездаволены: у лесе было вельмі цёмна.

— Навошта тут вырас гэты лес? — бурчаў ручай. — Каму ён патрэбен? Навошта ён закрывае ад мяне неба і сонца? Чаму ён не прапускае да мяне ні сонечных праменьняў, ні ветрыкаў? Як было-б добра, калі-б прышлі людзі і высеклі гэты лес.

А дрэвы шэпчуць яму ў вадказ:

— Калі-б ты болей ведаў, ты ня лаяў-бы нас: бяз нашага ценю цябе высушаць сонца і вецер. Без ляснога

ценю высыхаюць не такія маленькія ручайкі, як ты.

Не паверыў ручай словам дрымучага лесу.

Але вось прышлі людзі з сякерамі і высеклі лес.

Ручаёк застаўся бяз ценю і хутка высах: высушылі яго гарачыя сонечныя праменьні ды вецер.

---

1. З чаго быў нездаволены ручай?
2. Што яму сказалі дрэвы?
3. Што сталася з ручаём, калі людзі высеклі лес?
4. Чаму гэтак сталася?

Слоўнічак:

Ручай — a brook.
Дрымучы лес — the sleeping forest
Драмаць — to nap, to sleep.
Нездаволены — not satisfied.

ВЕСНАВАЯ ПРАГУЛКА

Прыселі на хвілінку
Ля сонечнай палянкі
Дзьве мілыя дзяўчынкі,
Абедзьве гараджанкі.

Вакол зьвінелі трэлі,
Таварышкі глядзелі:
Усё тут зіхацела,
Блішчэла, шапацела.

Шумелі верхавінкі
Зялёнаю красою.
Сказалі дзьве дзяўчынкі:
— Як хораша вясною!

Які тут водар чысты,
Які дубок цяністы!

Палянку пакідаюць
Сяброўкі-гараджанкі.
Як і раней, сьпяваюць
У лесе берасьцянкі.

І сонца над палянай...
Але... дубок зламаны,
І траўка пад бярозай
Пакрыта сьмецьцем розным.

Усё на ўзьлесьсі гэтым:
Ад семячак пакеты,
Трамвайныя білеты,
Паперкі ад ірысак...
(Прадоўжыць можна сьпісак).

Былы дубок цяністы
Ківае галавою,
Гаворыць сам з сабою:
"Якія эгаісты,
Якія эгаісты!"

---

1. Чаму дубок назваў дзяўчынак эгаісткамі?
2. Што благое зрабілі яны ў лесе?
3. Чаму ня можна сьмяціць у парках і ў лесе?

Слоўнічак:

Палянка — a clearing.
Гараджанкі — city girls.
Водар — odor, smell.

ВАРТАЎНІКІ САДУ

У ваднэй вёсцы было гэтулькі садоў, што ўся яна здавалася вялікім садам.

Дрэвы расьцьвіталі вясной, а ў густой зелені іхных галінак лёталі птушкі. Кругом чуваць было звонкія песьні і вясёлы шчэбет. Увосень-жа калыхаліся між лісьця яблыкі, ігрушы і сьлівы.

Але вось дзеці сабраліся і параськідалі птушыныя гнёзды. Птушкі пакінулі сады і болей сюды не прылятаалі.

Прышла новая вясна. Але ў садох было ціха і сумна. Там разьвяліся шкодныя вусені, якіх раней зьнішчалі

птушкі. Яны зьядалі на дрэвах ня толькі цьвет, але і лісьце. І дрэвы стаялі ўлетку голыя, як зімою.

Прышла восень. У садох ня было ні яблыкаў, ні ігрушаў, ні сьліваў.

Слоўнічак:

Сады – orchards.
Вусені – caterpillars.

ВЕРАБ'ЁВЫ ГОСЬЦІ

Збудаваў верабей
На сьметніку хатку,
Палажыў у дзьвярах
Дубовую кладку.
Учыніў верабей
На прыпечку жніва,
Змалаціў, наварыў
Пшанічнага піва.

Як пачаў верабей
Ды гасьцей склікаці,
Як пачаў верабей
Гасьцей сустракаці: –
Едзе сам журавель,
А за ім карасьцель;
Едзе і сініца –
Родная сястрыца;
Едзе і чачотка –
Вераб'ёва цётка;
Гусь з гусянятамі,
Качка з качанятамі,
І сарока белабока
Прыляцела тут здалёка.
Рады шэры верабей –
Шмат наехала гасьцей!
Чым-жа частаваці?
Узяліся госьці
Абед гатаваці.
Журавель з чачоткай
Грэчку малацілі,
Курапатка з гускай
Да млына насілі.
Бусел круціць,
бусел меле,
а крук засыпае.
А сінічка невялічка
Муку абірае.
Мукі з млына прынясьлі,
Бліноў смачных напяклі.
Сталі есьці, сталі піць,
Вераб'я таго хваліць.
Тут музыкі як зайгралі,
Усе госьці заскакалі,

Усе госьці засьпявалі:
"Дылі-дылі, гуль-гуль-гуль!
Дылі-дылі, буль-буль-буль!"

(З народнага)

НАШ АГАРОД

Пры нашай школе ёсьць агарод. Першая кляса таксама мае свае градкі.

І чаго тут не пасаджана! І морква салодкая, і бурачкі, і капуста, і агурочкі, і цыбуля, і памідоры, і мак, і бульба, і нават гарбузы.

Агарод невялікі, але абгароджаны і добра дагледжаны. Дзяжурныя вучні полюць, носяць ваду, паліваюць градкі.

Многа работы дзецям. Затое і агарод які! Усё ў ім расьце на славу.

А перад школаю мы пасадзілі дрэвы і кветкі.

Хораша ля нашай школы.

ГАРОДНІНА

Кухарка прынесла дахаты:
Цыбулю,
Капусту,
Пятрушку,
Таматы,
Бульбу,
Салату,
Бурак
І гарох...
Ох!

Прынесла кухарка,
А ў кошыку – сварка:
Хто зь іх мацнейшы,
Зграбнейшы,
Смачнейшы
І разумнейшы –
Цыбуля?
Капуста?
Пятрушка?
Таматы?
Бульба?
Салата?
Бурак
Ці гарох?
Ах!
Накрычаліся аж страх!
А кухарка іх – на стол,
Ножыкам – чах!
Пакрышыла,
Перамыла
Цыбулю,
Капусту,
Пятрушку,
Таматы,
Бульбу,
Салату,
Бурак
Ды гарох –

І ў кацёл!

Юльян Тувім.

НАШ ВЯЛІКІ ПАЭТ – ЯНКА КУПАЛА.

(Дзіцячыя і юнацкія гады)

Бацька Янкі Купалы ня меў сваёй гаспадаркі, мусеў зямлю арандаваць у таго ці іншага пана. А як зыходзіў тэрмін арэнды, трэба было пакідаць абжытае месца і шукаць новага прыстанку. Частыя пераезды перашкаджалі Янку рэгулярна вучыцца ў школе. У тыя часы для дзяцей небагатых навука была наагул цяжка даступнай. Ужо ў сярэдняй школе трэба было плаціць за навуку. Таму большую частку ведаў у дзіцячыя і юнацкія гады Купалу давозілася набываць самому. Сястра Янкі Купалы расказвае, як Янка, будучы яшчэ невялікім хлапчуком, вельмі любіў чытаць кнігі:

”Янка вельмі любіў чытаць. Кніжак сваіх у нас ня бы-

ло. І Янка пазычаў іх у суседзяў па ўсёй аколіцы.

Удзень чытаць яму ня было часу, бо трэба было працаваць на гаспадарцы. Янка чытаў увечары і ўначы. Чытаў пры лямпе, пры лучыне, на начлезе пры вогнішчы. Сядзе, бывала, толькі вечарам за кнігу, а яго пачынаюць гнаць спаць.

– Кідай сваё чытаньне. Няма чаго вачэй сьляпіць і дарэмна газу паліць.

Патушаць лямпу, а ён запаліць лучыну і чытае. У сьвяточныя дні, улетку, ён зранку браў кнігі і на цэлы дзень зыходзіў у лес. Кніжцы ён аддаваў кажную вольную хвіліну. Што-б не рабіў – заўсёды пры сабе меў кніжку.

Пашле бацька Янку пасьвіць скаціну, а праз некаторы час пасылае каторую з нас да яго.

– Зьбегай, паглядзі, што там Янка робіць. Зачытаецца, вядома, а скаціна ў шкоду зойдзе.

Я з ахвотай бегала да Янкі. Прыбягу... бачу: Янка чытае, а коні ў збажыне. Я адганю коней і пайду дадому, а ён, бывала, і не заўважыць, што я прыходзіла."

Вучыўся Янка Купала ў прыпадковых вандроўных настаўнікаў, а калі яму было пятнаццаць год, бацькі аддалі яго ў народнае вучылішча. Школу гэтую Янка скончыў за адну зіму. Ён многа чытаў і таму ведаў больш, чым вымагала праграма.

У Янкі было вялікае жаданьне вучыцца далей. Але бацька ягоны быў бедны, ня мог плаціць за навуку дый хацеў, каб сын памагаў яму ў гаспадарцы. Юнак разам з бацькам араў поле, касіў, сек дровы ў лесе. Пасьля бацька вельмі шкадаваў, што ня вучыў сына.

---

1. Чаму Янка Купала мусіў пераважна сам вучыцца?
2. Калі знаходзіў Янка час чытаць кніжкі?

3. Чаму Янка змог гэтак хутка закончыць народнае вучылішча?

4. Чаму ён ня мог далей вучыцца?

Слоўнічак:

Гаспадарка – a farm.
Арандаваць зямлю – to rent land.
Лучына – wood splinter (used for lighting)
Пасьвіць скаціну – tend grazing cattle.
Жаданьне – desire, wish.
Касіць – to mow (hay or grains) with a scythe.
Араць – to plow.

ВУЧЫСЯ...

Вучыся, нябожа, вучэньне паможа
Змагацца з нядоляй, з няволяй...
Што мучыць сягоньня, што думкі трывожа, –
Зьбяжыць і ня прыйдзе ніколі.

Крыўдзіцеляў зможаш, сьлед вечны праложыш
І к долі, і к волі, і к славе...
Адно ты прачніся, вучыся, як можаш, –
Ці дома, ці на школьнай лаве.

Янка Купала

Слоўнічак:

Нядоля – misfortune, bad luck.
Воля – freedom.
Трывожыць – to scare, to make afraid.
Доля – better life.

РОДНАЕ СЛОВА

(Апавяданьне з жыцьця Янкі Купалы)

У ціхай бакоўцы з вузкім акенцам міргае газовачка. Пры яе цьмяным сьвятле хлапец нізка схіліўся над сьпісаным лістком паперы. Нечакана ў бакоўку ўваходзіць маці. Сын зьдзіўлены:

– Ты ня сьпіш, мама?

– А ты? Усё кнігі чытаеш...

– Кнігі, мама, вучаць, як жыць. Паны і падпанкі нас за людзей ня лічаць, але яны яшчэ ўбачаць, хто мы. Ты паслухай, мама:

Што я мужык, усе тут знаюць,
І як гэты сьвет вялік,
З мяне сьмяюцца, пагарджаюць, –
Бо я мужык, дурны мужык...

У цеснай баковачцы зьвініць малады, сьмелы і горды голас. Маці, падпёршы рукою твар, ловіць кажнае слова – такое блізкае і зразумелае. На вачох у яе выступаюць сьлёзы.

– Хто гэтак напісаў пра нас, сынку? – ласкава пытаецца яна.

Сумеўшыся ад гэтага пытаньня, юнак пераводзіць погляд на подпіс, пастаўлены пад вершам, і паціху вымаўляе:

– Янка Купала, мама.

– Яму можна верыць, – кажа маці і спагадліва глядзіць на сына.

– Не надрывайся, Яначка. Перад табой-жа толькі пачынаецца твая дарога...

В. Вітка

---

1. Які першы верш прачытаў Янка маці? Перапішэце яго.
2. Якое прозьвішча падпісаў пад вершам Янка?

Слоўнічак:

Бакоўка — little room.
Горды — proud.
Ласкава — kindly.
Подпіс — signature
Спагадліва — with sympathy.
Надрывацца — to overwork oneself.

ВОЛЯ

І люблю-ж я, люблю
Гэту волю сваю!
Зямлёй лягу ў зямлю –
Вазьму волю сваю.

Нашто сокалам быць,
Так высока лятаць, –
Толькі-б воляю жыць,
Толькі-б путаў ня знаць.

Эх, каб так раскаваў
Петлі ўсе ў ланцугу, –
Я-б усім паказаў,
Як быць вольным магу!

Зямлёй лягу ў зямлю,
Але перш прапяю,
Як я волю люблю,
Гэту волю сваю!

Я. Купала

Слоўнічак:

Сокал — a falcon.
Ланцуг — a chain.

БАЦЬКАЎ ГАСЬЦІНЕЦ

(Апавяданьне пра дзяцінства Я. Коласа)

Памалу ўсталёўвалася вясна.

Уначы марозік яшчэ зацягваў лужы тоненькім лёдам, але ўжо з зямлі прабіваліся першыя зялёныя парасткі травы. Каторы дзень зьвінелі над палямі срэбныя званочкі жаваранкаў. А ўчора рушыў Нёман, і ўвесь луг заліло вадой.

Ці-ж такой парой уседзіш у хаце?

Костусь з Уладзікам і Алесем з самага ранку забаўляліся на дварэ. Прыгравала сонейка, і маленькія ручаінкі беглі з-пад сьнегу, што яшчэ ляжаў за хлеўчыкам. У паветры стаяў нясьціханы гоман вясны: сьпявалі птушкі, шумеў Нёман, звонка булькалі ручайкі.

– Глядзі, на дубе ўжо сядзяць шпакі, – сказаў Алесь.

Запраўды, на высокім тоўстым дрэве, між галін з леташнім лісьцем, сядзелі чорныя птушкі.

– Дзіва ўбачыў – шпакі. Вунь ужо і бусел ля балота пахаджвае, – паказаў Костусь.

Хлапцы пускалі караблікі, бегалі па беразе ракі. Костусь набраў поўныя боты вады, але дамоў ніхто не хацеў ісьці. Маці ледзь дачакалася іх.

Пад вечар са Стоўпцаў прыехаў бацька з дзядзькам Антосем.

– Ну, хлопцы, вясна – хутка канец вучобе, – сказаў ён, зьвяртаючыся да Алеся і Костуся. – Паглядзім, чым вы пахваліцеся бацьку ў канцы заняткаў... А ты, Костусь, што задумаўся?

– Ён вершы напісаў пра вясну, – адразу-ж сказаў бацьку Алесь.

– Ну, прачытай, сынок, а мы паслухаем.

Костусь адчуваў сябе няёмка, але пастанавіў пачытаць. Ён выйшаў на сярэдзіну хаты. Маці, падпёршы рукой галаву, стаяла ля печы і ўважліва глядзела на сына. Дзядзька курыў цыгарку. У яго прыжмураных вачох была лагоднасьць і ўвага. Гэта падбадзёрыла Костуся, і ён пачаў:

– Сонца грэе, прыпякае,
Лёд на рэчцы затрашчаў.
Цёплы вецер павявае,
Хмар дажджлівых нам прыгнаў.

Вось і бусел паказаўся,
Гусі дзікія гудуць,
Шпак на дубе рассьпяваўся,
Жураўлі ужо лятуць.

Костусь глянуў на бацьку. Той здаволена слухаў і ківаў у знак згоды галавой.

І зіма, як дым, прапала!
Зелянее луг, ральля...
Як ад болю, ачуняла
Наша родная зямля.

сьмела закончыў сын.

– Сам напісаў, ня хлусіш? – дапытваўся бацька. – Ну, і малайчына! Ты ў мяне далёка пойдзеш... Хадзі, сынок, бліжэй...

Міхал прытуліў Костуся і пацалаваў.

– На гасьцінец табе за гэта, – працягнуў бацька Костусю кніжку.

С. Александровіч

---

1. Як апісваецца ў вапавяданьні набліжэньне вясны?
2. Чым займаліся хлапцы на дварэ?
3. Пра што склаў верш Костусь?
4. За што даў яму бацька кніжку?

Слоўнічак:

Гасьцінец – a present.
Гоман – noise.
Бусел – stork.
Караблі, караблікі – boats, ships.
Адчуваў сябе няёмка – he felt uneasy.
Падбадзёрыць – to encourage.
Згода – agreement.
Ачуняла – she became well.
Сьмела – boldly.

Л Е Т А

Раздольле ў лузе, эх, раздольле!
А колькі сьмеху і свавольля,
І жартаў, плюскату, штурханьня
Над гэтым Нёмнам у купаньне!
І хіба можна ўжо ўстрымацца,
У час касьбы не пакупацца?
І дзе на сьвеце ёсьць такая,
Як Нёман, рэчанька другая?
Тут хвалі сьветлы, срэбралітны,
А беражкі – ну, аксамітны,
На дне пясочак жоўты, чысты,
Вадою згладжаны, зярністы,
У воду пойдзеш – шчасьце раю,
Я шчасьця большага ня знаю.

Якуб Колас

Ж У Р А В Е Л Ь

Абляцеў журавель
Мораў шмат, шмат зямель.
Абляцеў, абхадзіў,
Свае крылы натрудзіў.
Мы спыталі ў жураўля:
– Дзе ёсьць лепшая зямля?
Журавель нам даў адказ:
– Няма лепшай, як у нас.

П. Варанько

Л Е Т А

Адцьвілі фруктовыя сады, асыпаліся ружова-белыя пялёсткі яблыняў. Надыйшоў чэрвень – першы месяц лета.

У чэрвені чырванеюць суніцы, каласуе жыта, пшаніца. Замаўкаюць птушыныя сьпевы. У бальшыні лясных птушак ужо выведіся маленькія птушаняткі.

Надыходзіць ліпень. Ліпень у Беларусі найгарачэйшы летні месяц. Гэта сярэдзіна лета. Дні стаяць сьпякотныя. Высока зьзяе ў бязвоблачным небе яркае сонейка.

Часта бываюць дажджы з навальніцамі. Пачынаецца сенакос. У лесе сьпеюць маліны, пачынаюць расьці першыя грыбы. За ліпнем надыходзіць жнівень – апошні месяц лета. У жніўні пачынаецца жніво. З самага раньня да вечара на палёх стракочуць жняяркі, камбайны: гэта сяляне зьбіраюць з палёў ураджай.

У садох сьпеюць яблыкі, грушы, сьлівы. Сонечныя праменьні ўжо не такія гарачыя; яны цяпер толькі грэюць, але не пякуць, як у ліпені.

У прыродзе адчуваецца набліжэньне восені.


---

1. Чым розьніцца лета ад вясны?
2. Які летні месяц найгарачэйшы?
3. Якія палявыя работы выконваюць сяляне летам?
4. Пералічэце летнія месяцы.

Слоўнічак:


Сьпякотны – гарачы, hot (weather)
Сонейка зьзяе – sun shines.
Бязвоблачнае неба – неба бяз хмараў.
Навальніца – бура, rainstorm.
Маліны – raspberries.
Маліны сьпеюць – raspberries become ripe.
Жніво – harvest.
Прырода – nature.

У ГРЫБОХ





Пад нагой хрумсьціць igліца
І шуміць смалісты бор...
Сыраежкі і лісіцы –
Усе нібы на падбор.

Але іх мы абмінаем;
Надта многа ўжо такіх.
Хмызьнякамі мы блукаем
І бярэм баравікі.




Падасінавікі ўбачым –
Іх падрэжам на камлі.
Вось удача дык удача –
Нездарма сюды прышлі.

То на ўзгорак, то з узгорка –
Як прыгожа у бары!
Скача спрытная вавёрка
Па галінках угары.

Поўны кошыкі! Даволі!
Нам дамоў зьбірацца час.
Хай расьце грыбоў тут болей –
Мы прыйдзем па іх ня раз!

А. Ставер

ЗВОНІЦЬ ПОЛЕ

Звоніць поле доляй, воляй,
Звоніць поле ў каласкі.
У буйным лузе зьзяюць, граюць
Кветкі, мошкі, матылькі.

Рэчка ўецца і сьмяецца
Да зялёных лоз і вольх,
А ў вадзіцы шыбка рыбка
Мільгаціць на паплаўкох.

Я. Купала

ЯГАДЫ

Які сяголета шчасьлівы
І ураджайны выпаў год:
У ўсіх садох агрэст і сьлівы,
Суніцаў повен агарод.

Пустыр закінуты калішні —
І той увесь зазелянеў,
І наліліся сокам вішні,
Аж ломяцца галіны дрэў.

А за аселіцай, над рэчкай,
Паміж разгалістых крушын,
Набракла дзікая парэчка,
Кусты смародзін і ажын.

А што за ягады лясныя
У нас адразу зацьвілі,
Як толькі промні веснавыя
Цяпло разьнесьлі па зямлі.

Спачатку сочныя суніцы
Заружавелі па лясох,
За імі сьледам і чарніцы
Закрасавалі ў верасох.

Цяпер салодкія маліны
Свае галовы хіляць ніц,
І ўсе сухія баравіны
Пакрыты завязьзю брусьніц.

І ўсе балотныя палянкі
Цьвітуць агнямі журавін,
І неўзабаве ўспыхнуць гранкі
Чырвоных, яркіх арабін.

Які сяголета шчасьлівы
І нязвычайны выпаў год,
Які багаты і ўрадлівы
І сад, і лес, і агарод!

Пятро Глебка

ЦІКАВАЯ ЛЕКЦЫЯ

Дзеці атрымалі новыя сшыткі. Антось агледзіў сшыток і кажа:

– Такія сшыткі робіць мой тата! Мой тата працуе на фабрыцы паперы.

– Ня толькі твой. І мой таксама! – адазваўся Янка.

– І мой!

– І мой! – крычаць другія дзеці.

– І мая мама! – сказала Ірка.

– А ці быў хто з вас на фабрыцы? – папыталася настаўніца.

Аказалася, што так. І Антось быў, і Ірка была, і іншыя.

— Дык можа вы раскажаце, як робіцца такі сшыток?

Дзеці пачалі расказваць.

Паперу робяць з яловай драўніны. Яе раствараюць у вялікіх кадзях на масу. Потым гэтая драўляная маса праходзіць праз розныя машыны. Яны качаюць яе так, як валкам качаецца цеста. Толькі вельмі тоненька. А потым гэтае драўлянае цеста сохне, і з яго ўжо выходзіць папера.

У расказе выглядала гэта вельмі проста. Але не на фабрыцы. Фабрыка вялізарная. Поўна там розных машынаў. Машыны грукацяць і скрыгаюць. Яны працуюць вельмі хутка. Навіваюць гатовыя, белыя істужкі паперы на вялізныя шпулі. А потым іншыя машыны рэжуць паперу, друкуюць на ёй клеткі і лініі ды робяць сшыткі.

Дзеці расказвалі. Яны так былі занятыя, што ня чулі нават званка на перапынак.

Слоўнічак:

Яловая драўніна — pine wood.
Істужкі — ribbons.

АЛЬФАБЭТ

З печы альфабэт упаў,
Пакаціўся,
Тое-сёе паламаў,
Разваліўся:

І — згубіла крапку,
Л — адбіла лапку.
В — схуднела трошкі,
А — зьвіхнула ножкі.
О — перапужалася,
На два С распалася.
Т — свой дах згубіла,

Ж – крыло адбіла.
Б – угнула пуза,
Ю – шукай між друзу.
С – канцы свае зьвяло,
Выдае сябе за О.

Ю. Тувім

РАСКАЗЫ ПРА ШКОЛЬНУЮ ТОРБУ

I.

Штодня ты сядаеш за школьную лаўку, штодня бярэш у руку пяро. Ці ты калі падумаў, чаму пяро завецца пяром?

Яно-ж ня вырвана з птушынага крыла ці хваста, але зроблена са сталі.

Дык чаму-ж птушынае пяро і пяро да пісаньня маюць адзін назоў?

Даўно, вельмі даўно пяро да пісаньня было запраўды птушыным пяром. Сотні год птушкі давалі людзём пёры, якімі напісана шмат прыгожых кнігаў.

Вазьмі гусінае пяро, намачы ў чарніла і папрабуй пісаць. Напэўна зробіцца клякса на паперы.

Дык як-жа ім людзі пісалі?

Пяро трэба прытарнаваць да пісаньня.

Войстрым нажом зрэж наскос ягоны канец. Разрэж кончык на дзьве роўныя палавінкі, так як гэта зроблена ў стальным пяры. Калі, пішучы, ты націскаеш на пяро, шчылінка расшыраецца, і чарніла сьцякае паміж берагамі, як ручаёк.

Стальное пяро ты купляеш гатовае. Даўней шмат часу трэба было траціць на вастрэньне пёраў. Ня думай, што гэта было лёгка. Перш за ўсё трэба было вельмі ўважаць, каб кончык пяра расшчапіць пасярэдзіне. Апрача

таго гэтыя пёры былі вельмі нятрывалыя і часта псаваліся, ступляліся. Трэба было іх зьмяняць. І таму каля даўнейшай чарнільніцы ляжалі новыя, запасныя пёры, а ў місачцы з сухім дробным пяском адпачывалі тыя, якімі ўжо пісалі.

– У пяску? – папытаешся. – Чаму?

Ці ты бачыў у зьвярынцы, як слонь пасьля купаньня старанна пасыпае пяском свае бакі, сьпіну і вушы? Пясок яму замяняе ручнік. Пясок добра паглынае вогкасьць.

Цяпер ты лёгка адгадаеш, для чаго служыць начыньне зь пяском. Напісаўшы старонку, пасыпалі яе пяском, і калі пісьмо высахла, страсалі пясок з паперы і адварочвалі лісток на другі бок.

Чарніла таксама было іншае, не такое як цяпер. Літаркі былі пасьля напісаньня бурыя, толькі праз некаторы час яны цямнелі, рабіліся больш выразнымі.

Чарніла, якім ты цяпер пішаш, вырабляюць на вялікім хімічным заводзе. Найважнейшая сыравіна для вырабу чарніла – гэта адпаведны хварбавальнік.

Хварбавальнікі ёсьць розных колераў, таму і чарніла бывае зялёнае, сіняе, чырвонае.

А з чаго вырабляюць хварбавальнікі?

– Сіні хварбавальнік мы атрымоўваем з чорнага каменнага вугалю.

– А зялёны?

– Таксама з каменнага вугалю.

– А чырвоны?

– Чырвоны хварбавальнік таксама атрымоўваем з каменнага вугалю.

– Як-жа гэта? Ці-ж запраўды сіні, зялёны і чырвоны колеры атрымоўваем з чорнага вугалю?

— Гэта чарадзействы хіміі. Хімікі ўмеюць рабіць розныя цуды.

II.

Калі мы гаворым аб хварбавальніках, то трэба памятаць, што першыя пачынаюць работу вуглякопы. Яны здабываюць пад зямлёю каменны вугаль. Чыгуначнікі вязуць вугаль на заводы. На заводах работнікі здабываюць з каменнага вугалю чорную смалу. З чорнай смалы — бясколерную як вада вадкасьць. А з гэтай бясколернай вадкасьці робяць хварбавальнікі розных колераў.

Вось якая гэта чараўнічая навука — хімія! З чорнага робіць бясколернае, а зь бясколернага — зялёнае, сіняе, чырвонае.

У зямлі ёсьць руда. З руды выплаўляюць сталь. Сталь раскатваюць на тонкія лісты бляхі і завозяць іх на фабрыку пёраў.

Там стальныя лісты падлягаюць шмат якім зьменам.

Адна машына кроіць бляху на вузкія палосы. Другая выразае з гэтай паласы малыя кавалкі, а з гэтых кавалкаў сталі робяць пёры.

Такая стальная бляшка ўжо падобная да пяра, але ім яшчэ нельга пісаць. Яно плоскае, і таму чарніла ня ўтрымалася-б на ім. Каб кропелька чарніла магла ў ім спыніцца, трэба бляху сагнуць так, каб яна была падобная да карытца. А кончык трэба разрэзаць, каб чарніла мела дарожку сьцяканьня. Усё гэта робяць машыны.

Потым у гарачай, вельмі гарачай печы гартуем пяро, робім яго цьвёрдым. І, урэшце, чысьцім, пакрываем яго бліскучым нікелем, каб яно не ржавела. І наша пяро ўжо гатова!

Бачыш, якія выдумалі машыны, каб ты мог пісаць

стальным, а ня гусіным пяром.

Замест пяску да сушэньня ёсьць прамакатка.

А гумка? Цяжка было-б вучню жыць бяз гумкі. Яна — верны сябра алавіка. Праўда яна любіць чысьціню й парадак, але сама ходзіць брудная й занядбаная. Калі алавік прыпадкова памыліцца, гумка сьцірае памылку.

Даўней гумкі рабілі з соку такіх дрэваў, якія растуць толькі ў цёплых краёх. А сяньня з бульбы гоняць сьпірт, а са сьпірту робяць каўчук. Такім чынам, гумкі дае нам бульба.

III.

Калі-б даўнейшы вучань зазірнуў у тваю торбу, паглядзеў на тваю лаўку, ён вельмі зьдзівіўся-б. Што гэта? Пяро — ня гусінае, алавік — замест грыфеля, сшыток — замест грыфельнай дошкі, прамакатка — замест пяску, сіняе чарніла з вугалю і гумка!

А падумай, як-бы ён дзівіўся, калі-б мы яму паказалі "вечнае пяро"!

Гэта, бадай, жарт — такое пяро, якога ня трэба кажную хвіліну мачаць у чарніла! Пяро, якое носіць сваю чарнільніцу з сабою!

Як-жа яно можа піць? Яно-ж ня жывое?!

Вось расказ пра школьную торбу. У ёй жывуць твае старыя прыяцелі: сшыток, пяро, алавік і гумка!

Кажны з іх прайшоў доўгі шлях.

Яны прышлі к табе з лясоў, дзе растуць елкі. Прышлі з зямлі, дзе ляжыць вугаль, графіт, гліна, зялезная руда. Яны прайшлі праз ваду і агонь. Па дарозе яны так зьмяніліся, што ты не адразу будзеш магчы сказаць, з чаго яны зробленыя.

Як мала важыць школьная торба! А колькі людзей

працавала, каб у ёй было ўсё, што табе патрэбнае.

Землякопы капалі гліну на алавік, дрывасекі секлі елку на сшыток, гарнякі здабывалі вугаль і руду на пёры і ножыкі, мэталургі варылі сталь, папернікі рабілі паперу, друкары друкавалі кнігі, хімікі рабілі чарніла. Далёка да канца. Усіх не пералічыш!


---

1. Адкуль паходзіць назоў пяра, якім мы пішам?
2. Як трэба было прытарнаваць гусінае пяро да пісаньня?
3. Чаму пёры клалі ў сухі пясок?
4. З чаго робіцца цяпер чарніла?
5. З чаго робяцца пёры да пісаньня?
6. З чаго робіцца гумка?

Слоўнічак:

Сталь — steel.
Шчылінка — a little crack
Нятрывалы — not lasting a long time.
Ступляцца — to become dull.
Запасныя пёры — Reserve pens.
Вогкасьць — wetness.
Выразны — clear, easy to read.
Сыравіна — raw material.
Цуды — wonders.
Чарадзействы — magic.
Вуглякопы — coal miners.
Смала — tar.
Вадкасьць — liquid.
Руда (зялезная) — (iron) ore.
Палаcа — a strip.
Бляха — tin.
Ржавець — to rust.
Доўгі шлях — long way.
Гліна — clay.
Друкаваць — to print.

ЗУБРЫ Ў БЕЛАВЕСКАЙ ПУШЧЫ



Мы паехалі ў Белавескую пушчу паглядзець зуброў. Спыніліся на адным узгорку, чакаем. Хутка прыехаў лясьнічы і сказаў:

— Хавайцеся, лясьнікі гоняць сюды чараду зуброў. Скокнулі мы за тоўстыя дрэвы, углядаемся. Чуем: моцна трашчыць сухое гальлё і кусты.

Неўзабаве ў зарасьніку замільгалі дзьве чорныя тушы. Яны то злучаліся, то разлучаліся і беглі проста на нас. Гэта былі старыя самцы. Іх лёгка пазнаць: шырокія рагатыя іхныя ілбы надта зарасьлі доўгай шэрсьцю, якая зьвісала ўніз барадою.

Зубры, відаць, убачылі нас ці можа пачулі нюхам. Яны абмінулі ўзгорак і, лёгка пераскокваючы цераз паваленыя на зямлі дрэвы, зьніклі з ачэй.

Праз некалькі хвілінаў таксама бокам прамільгнула яшчэ некалькі зуброў.

Разглядаць як мае быць гэтых выдатных жыхароў пушчы мы змаглі толькі ў зьвярынцы. Былі там старыя самцы, маладыя бычкі і самкі з цялятамі. Маладыя цяляткі, чорныя як жукі, бязрогія, сьмешныя, з шырокімі ілбамі і шырокім перадам, з вузкім целам, хутка бегалі за сваімі маткамі і мычэлі.

Слоўнічак:

Зубр — animal, similar to a buffalo.
Самцы — male animals.
Самкі — female animals.
Цяляты — calves.

КОТ І ЛІСІЦА

(Народная казка)

I.

Жыў сабе дзед ды баба. І быў у іх кот — лянівы, але памаўзьлівы. Мышэй ня ловіць, а толькі ў шкоду залезьці наровіць. Даўся ён бабе ў знакі: то збанок з малаком аберне, то сьмятану зьліжа, то сала ўкрадзе.

Вось баба і кажа дзеду:

— Завязі ты, дзеду, гэтага шкадлівага ката ў лес.

Укінуў дзед ката ў мяшок, завёз у лес і выпусьціў. А сам назад вярнуўся.

Ідзе кот лесам і плача. Сустракае яго лісіца.

— Чаго, коця, плачаш?

Расказаў ёй кот пра сваю прыгоду.

— Ідзі да мяне жыць, — кажа лісіца. — Будзеш у мяне за гаспадара.

Згадзіўся кот і застаўся жыць у лісіцы.

Бяжыць мядзьведзь па лесе: трэсь-лом! трэсь-лом! трэсь-лом!

Пачула лісіца, выбегла з хаты ды як закрычыць:

— Хто гэта ў маім лесе трашчыць? Хто майму гаспадару спаць не дае?

— А хто-ж у цябе гаспадар? — пытаецца мядзьведзь.

— У мяне гаспадарышча, хвост з памялішча: як махне, дык адразу заб'е!...

Напужаўся мядзьведзь ды ходу далей ад бяды.

Бяжыць неўзабаве па лесе воўк: трэсь-лом! трэсь-лом! трэсь-лом!

— Хто гэта ў маім лесе трашчыць? У майго гаспадарышча хвост з памялішча: як махне, адразу заб'е!...

І воўк спужаўся. А потым лісіца напужала і дзіка, і зайку.

II.

Сабраліся зьвяры й думаюць-гадаюць: які гэта гаспадар у лісіцы? Хоць-бы паглядзець на яго.

— Вось што браткі, — кажа мядзьведзь, — трэба пачастунак згатаваць, а потым у госьці яго запрасіць. Тады мы яго і паглядзім.

— Добра, — згадзіліся зьвяры.

— Я, — кажа мядзьведзь, — пайду па мёд, ты воўк — па мяса, ты дзік — па хлеб, а ты, зайка, як лягчэйшы, бяжы гаспадара ў госьці запрашаць.

Як сказалі, так і зрабілі.

Падбег заяц да лісіцынай хаткі і кажа:

— Добры дзень! Прасілі зьвяры, каб вы ласкавы былі, да нас у госьці прышлі.

Сказаў так заяц перапалоханым голасам ды назад.

Сабраліся зьвяры госьця сустракаць. Заяц і кажа:

– А ўсё-ж, браткі, боязна так сядзець. Хто яго ведае, які там гаспадар. Яшчэ ўзлуецца ды ўсіх нас перадушыць... Давайце лепш схаваемся, ды здалёку на яго паглядзім.

Згадзіліся зьвяры з зайцам і пачалі хавацца. Мядзьведзь на дуб узьлез, дзік у мох зашыўся, воўк пад куст, а заяц у траву схаваўся.

III.

Прыходзіць кот з лісіцаю. Убачыў кот пачастункі і адразу на мяса накінуўся. Есьць ды ўсё варчыць: "Мала, мала!"

– Ну, – думаюць зьвяры, – запраўды страшны гаспадар у лісіцы: такі кус мяса ўплятае, а ўсё мала крычыць.

Дзік ляжаў, ляжаў ды ад страху пачаў хвастом варушыць. А кот падумаў, што гэта мыш, скокнуў туды ды ўчапіўся кіпцюрамі ў дзікаў хвост.

Як усхопіцца дзік, як пойдзе па лесе!... Толькі гальлё трашчыць.

Кот напужаўся ды скок на дуб.

"Ну, – думае мядзьведзь – гэта ён мяне ўбачыў. Трэба ратавацца, пакуль ня позна." Грымнуўся ён з дуба на куст, пад якім воўк ляжаў. Воўку здавалася, што гэта сам лісіцын гаспадар на яго напаў, усхапіўся ды наўцёкі. А мядзьведзь за ім. Заяц вушы на сьпіну паклаў і таксама лататы даў.

А кот з лісіцаю наабедаліся і пайшлі сабе дахаты.

1. Чаму завёз дзед ката ў лес?
2. Хто яго прыняў да сябе да хаты?
3. Чаму зьвяры пачалі баяцца ката?
4. Як надумалі зьвяры пазнаёміцца з катом?
5. Што з гэтага выйшла?

Слоўнічак:

Шкода — damage.
Прыгода — adventure
Згадзіўся — he agreed.
Дзік — wild boar.
Кіпцюры — claws.

СТРАШНЫ ЗЬВЕР



Касавокі шарачок
Ад лісіцы ледзьве ўцёк;
Па палянцы ў лес імчыцца.
Зірк: а побач цень лажыцца!...

”Гэта нейкі страшны зьвер,
Не ўцячы ўжо мне цяпер:
Бач, наперад забягае”, –
Бедны зайчык разважае.

Заяц скок у лес якраз,
І зьнік цень у той-жа час...
Рад няшчасны шарачок:
– І ад гэтага я ўцёк!

---

1. Якога страшнага зьвера бачыў зайчык?
2. Калі можна бачыць свой цень?
3. Чаму цень зьнік, калі зайчык убег у лес?

ЧАРАЎНІЧЫЯ СЛОВЫ

Маленькі дзядок з доўгаю сіваю барадою сядзеў на лаўцы і парасонам рысаваў нешта на пяску.

– Адсуньцеся крыху, – сказаў Паўлюк і прысеў на беразе.

Дзядок адсунуўся і, глянуўшы на чырвоны, злосны твар хлопца, сказаў:

– З табою нешта здарылася?

– Ну і добра! А вам што? – коса глянуў на яго Паўлюк.

– Мне нічога. А вось ты толькі што крычаў, плакаў, сварыўся з некім...

– І яшчэ як! – злосна буркнуў хлапец. – Я хутка зусім з дому ўцяку!

– Уцячэш?

– Уцяку! Дзеля аднае Ленкі ўцяку. – Паўлюк сьціснуў кулакі. – Я ёй цяпер ледзь ня даў добра! Ніводнай хварбы не дае! А ў яе столькі!

– Не дае? Але дзеля гэтага ўцякаць ня варта.

– Ня толькі дзеля гэтага. Бабка за адну моркву з кухні мяне прагнала... Проста сьціркаю, сьціркаю...

Паўлюк аж засоп з абурэньня.

– Дурніна, – сказаў дзядок. – Адзін палае, другі пашкадуе.

– Ніхто мяне не шкадуе! – крыкнуў Паўлюк. – Брат на лодцы едзе катацца, а мяне не бярэ. Я яму кажу: вазьмі лепш, усёроўна я ад цябе не адчаплюся, вёслы выцягну, сам у лодку ўлезу!

Паўлюк стукнуў кулаком па лаўцы і змоўк.

– Ну і што-ж, не бярэ цябе брат?

– А чаму вы пра ўсё пытаецеся?

Дзядок пагладзіў доўгую бараду.

– Я хачу табе памагчы. Ёсьць два такія чараўнічыя словы...

Паўлюк аж падскочыў.

– Я табе скажу гэтыя словы. Але памятай: гаварыць іх трэба ветлівым голасам, гледзячы проста ў вочы таму, з кім гаворыш. Памятай – ветлівым голасам, гледзячы проста ў вочы...

– А якія гэта словы?

Дзядок нахіліўся да самага вуха хлопчыка. Ягоная мяккая барада дакранулася да Паўлюковай шчакі. Ен шапнуў нешта, і ўголас дадаў:

– Гэта чараўнічыя словы. Але не забудзься, як іх трэба вымаўляць.

– Я паспрабую, – усьміхнуўся Паўлюк, – зараз-жа паспрабую.

Ён устаў і пабег дамоў.

Лена сядзела за сталом і рысавала. Хварбы зялёныя, сінія, чырвоныя ляжалі перад ёю.

Убачыўшы Паўлюка, яна адразу згарнула іх у кучу і накрыла рукою.

"Абмануў дзядок, – з прыкрасьцю падумаў хлопчык, Хіба-ж такая зразумее чараўнічыя словы!..."

Паўлюк падыйшоў да сястры і пацягнуў яе за рукаво. Сястра аглянулася. Тады, гледзячы ёй у вочы, хлапец сказаў ветлівым голасам:

– Лена, дай мне адну хварбу... калі ласка...

Лена шырока адчыніла вочы. Падымаючы руку з хварбаў, яна прабармытала зьбянтэжана:

– Якую табе?

– Мне зялёную, – нясьмела сказаў Паўлюк.

Ён узяў хварбу, патрымаў яе ў руках, пахадзіў з ёю па пакоі ды аддаў сястры. Яму хварба ня была патрэбная. Ён думаў цяпер толькі аб чараўнічых словах.

"Пайду да бабкі. Яна якраз нешта пячэ. Прагоніць мяне, ці не?"

Паўлюк адчыніў дзьверы ў кухню.

Бабка здымала з пліты гарачыя піражкі.

Унук падбег да яе, абняў і павярнуў к сабе яе чырвоны, маршчыністы твар, глянуў у вочы і шапнуў:

– Дай мне кавалак піражка... калі ласка.

Бабка выпрасталася.

– Гарачанькага... гарачанькага захацелася, галубок мой! – прыгаворвала яна, выбіраючы найлепшы, румяны піражок.

Паўлюк аж падскочыў з радасьці і пацалаваў яе ў вабедзьве шчакі.

"Чараўнік! Чараўнік!" – казаў ён сам сабе, успамінаючы дзеда.

Пры абедзе Паўлюк сядзеў ціха. Калі-ж брат сказаў, што паедзе катацца на лодцы, Паўлюк палажыў яму руку

на плячо і ціха папрасіў:

– Вазьмі мяне з сабою... калі ласка.

За сталом усе адразу змоўклі. Брат падняў бровы і усьміхнуўся.

– Вазьмі яго, – сказала сястра. – Ці-ж гэта табе шкодзіць?

– Ну, чаму-ж бы яго ня ўзяць, – усьміхнулася бабка, – зразумела, вазьмі.

– Калі ласка, – паўтарыў Паўлюк.

Брат засьмяяўся, патрапаў хлапца па плячы, ускудлачыў яму валасы.

– Эх, ты падарожнічак! Ну добра, зьбірайся.

"Памагло! Зноў памагло!"

Паўлюк усхапіўся з-за стала і пабег на вуліцу. Але ў парку ня было ўжо дзядка. Лаўка была пустая. Толькі на пяску засталіся нарысаваныя парасонам незразумелыя знакі.

---

1. Як сустрэўся Паўлюк з дзядком-чараўніком?
2. Чаму Паўлюк хацеў уцячы з дому?
3. Якую параду даў дзядок Паўлюку?
4. Як гэтая парада памагла Паўлюку?

Слоўнічак:

Чараўнічыя словы – magic words.
Сівая барада – gray beard.
Шкадаваць (Паўлюка) – to feel sorry (for Pauluk)
Вёслы – Oars.
Зьбянтэжана – Embarrassed.
Маршчыністы твар – wrinkled face.
Бровы – eyebrows
Падарожнічак – little traveler

СКАРБ БАБКІ ГАЛЕНЫ

Было позна, калі ў хату ўляцела стомленая Надзя. Ганна скончыла якраз лекцыі, а бабка рабіла нешта каля печы.

– Чаго-ж ты так ляцела, Надзя? Ці воўк за табою гнаўся? – жартуе бабка і усьміхаецца да маладой суседкі.

Надзя шчыра абыймае старую.

– Бабка Галена, мая дарагая, – кажа яна ласкава, у мяне вялікая просьба да вас. Я заўтра буду сьпяваць у школе нашыя народныя песьні. Пазычце мне сваёй беларускай вопраткі на адзін вечар!

Бабка ківае галавой і глядзіць, дзе ключ ад скрыні. А Ганка скок да калка і прыносіць бабцы вялізны ключ. У скрыні ёсьць шмат чаго цікавага, і Ганка цешыцца, што гэта зараз пабачыць. Прыгожая каляровая беларуская вопратка ляжыць на самым версе. Ганна трымае ўжо ў руках доўгую сінюю спадніцу і белы палатняны фартух, вышыты чырвонымі ўзорамі. Але найпрыгажэйшая блюзка. Чырвона-чорная вышыўка пакрывае абодва рукавы. Ганна ня можа наглядзецца. Але бабка выймае ўжо чырвоненькую хустку ў рознакаляровыя кветкі ды накідае яе на цёмныя Надзіны косы.

– Бяры, даражэнькая, адзенься, – кажа бабка Галена. – А калі на вашым вечары будуць людзі з іншых краінаў, дык няхай паглядзяць, якая прыгожая наша беларуская вопратка.

ГЭЙ, НАПЕРАД!

Гэй, наперад, покі сэрца
    Б'ецца, рвецца на прастор!
Годзі млеці ў паняверцы;
    Гэй, да сонца! Гэй, да зор!

Хай бацькі стагналі ўчора,
    Ішлі на той сьвет без пары;
Сёньня ў нашай моцы гора,
    Мы жыцьця гаспадары!

Думка ў думку, дружна, сьмела
    Ўсе наперад грамадой!
Кожны ведай сваё дзела,
    Знай, за праўду крэпка стой!

Дык наперад, покі сэрца
    Б'ецца, рвецца на прастор,
Годзі млеці ў паняверцы!
    Гэй, да сонца! Гэй, да зор!

Янка Купала

ЯКІ ГЭТА ПАМОЧНІК?

Калі мама варочаецца з працы, на яе дома чакае шмат работы. Трэба нарыхтаваць вячэру тату, Алесі і Віцю. Алесіна сукенка на заўтра таксама яшчэ ня выпрасаваная. А тут ужо і цёмна робіцца.

Хаця і тата, і Алеся, і Віця памагаюць маме, пэўна мама не дала-б усяму рады. Але мама мае добрага памочніка. І хоць яго ня відаць, і ня чуваць, аднак гэта ён запальвае ясную лямпачку, калі пачынае цямнець. Ён ва-

рыць вячэру. Ён-жа награвае прас.

Ці вы здагадаецеся, які гэта памочнік у мамы?

ПСТРЫК

Глянь: тырчыць у сьценцы пстрычка,
Гэта – пстрычка-электрычка.
Пстрычкай пстрык зрабі рукой,
І сьвятло зальле пакой.
Проста, дзеці:
Пстрык – і сьвеціць!
Пстрыкнеш потым яшчэ раз –
Цемра ўраз
Агорне нас.
А як пстрыкнеш трэйці раз –
Сьвеціць зноў агонь, што згас.
Сілы ў пстрычкі шмат няўёмнай,
Хоць малая ледзь відна:
Цёмна – сьветла,
Сьветла – цёмна!
Што за гэткая яна?
Можа ў ёй сьвятляк схаваны?
Не, адкуль там сьветлячок,
Праваднік у ёй мядзяны,
Дрот такі, а ў дроце ТОК,
Робіш пстрык – уключыш ТОК,
Электрычны мклівы ТОК!
ТОК і сьвеціць?
Ён, браток!

Юльян Тувім.

КАЗКІ БАБКІ ЮГАСІ

(Апавяданьне пра дзяцінства паэткі Цёткі — Алёйзы Пашкевіч)

I.

Ліза за кажным стукам падымае галаву і ўзіраецца ў вакно: а мо' едуць дзядуня з бабуняй?

Не, глуха і спакойна шуміць лес, які падыходзіць да самага прыгуменьня.

У бакоўцы цёмна, толькі ў кухні гарыць газоўка. Праз адчыненыя дзьверы відаць нярухомы цень нянькі — бабкі Югасі.

Лізе аднэй сумна, і яна кліча:

— Бабуня, га бабуня! Ты сьпіш?

Цень сьхіснуўся, і ў дзьверах паказалася бабка Югася. Яна маленькая, крыху кульгавая, шчуплы твар яе ўвесь у зморшчынах. У вачох — ласка і пяшчота:

— Чаго-ж ты ня сьпіш, мае дзеткі? Я табе баяла-баяла байкі, потым бачу, ты прытаілася нішком, дык я шамуль-шамуль ды ў мыцельнік. Сьпі сабе, думаю... А яна і ня думае спаць...

— Калі-ж прыедуць з кірмашу? — папыталася Ліза. Чаму-ж так доўга няма?

— Блізкі сьвет Васілішкі. Трэба гэта было ім ехаць такой крутавеіцай... Сьпі, мая галубка! Ня скора яшчэ яны прыедуць...

— Нешта мне спаць ня хочацца, — адказвае Ліза і зноў падымаецца паглядзець у вакно.

— Чаму-ж, ты хіба занядужала? — бабка Югася прыклала сваю халодную шурпатую далонь да лобу дзяўчынкі. — Гэта-ж, пане мой, цалюткі дзень на дварэ гойсала, ледзьве ў хату дазвалася... А цяпер трэба выпіць бабчыных зёлак... Усялякая хвор адразу пройдзе...

– Не хачу я зёлак...

Але бабка пайшла на кухню і прынесла ў вялікай меднай конаўцы свае лекі.

Ліза знае гэтыя лекі. Стаяць яны на самай верхняй паліцы пад стольлю ў розных слоіках і чарапкох – там настойваюцца розныя карэньні ды кветкі. Частка зёлак сохне каля коміна ў торбачках і пучкох, шмат іх і ў куфэрачку, што стаіць у каморы.

– А раскажаш, бабуня, казку, то палавіну вып'ю, – падымаецца Ліза і ўмошчваецца на падушцы.

– Усё, усё, Лізанька, дык раскажу што-небудзь...

Дзяўчынка ўзяла ў рукі цяжкую конаўку, паднесла да губ, а ў вачох, якія пазіралі на бабку Югасю, засьвяціліся сьмех і гарэзьлівасьць:

– Будзе дзьве казкі, дык усё вып'ю...

– Будзе, будзе...

Ад лекаў духменіць пахам ліпавых кветак, чабору, малін і суніц...

– Вось і ўсё, і на здароўе, – кажа бабка і ласкава ўсьміхаецца. Пасьля яна падбівае падушку, укрывае Лізу коўдрай, садзіцца на ўслончык і некалькі хвілін маўчыць.

– Ну, бабуня, расказвай, – просіць Ліза.

– Якую-ж бо табе расказваць, – пачынае ўспамінаць бабка Югася.

– Ну, слухай, хіба гэтую...

Дзяўчынка прытаілася пад коўдрай і думае, дзе цяпер той зайчык, што бегаў учора ў іхным садзе і пакінуў сьляды каля Лізінай яблынькі. Нябось, недзе бегае, а мароз шчыпле яму за лапкі. Ліза зноў падымаецца і пазірае ў вакно.

– Ляжы, ляжы, нікога там яшчэ ня відаць, – кажа бабка.

— А зайкі ня відаць ля яблынькі? — пытаецца малая і пільна ўзіраецца.

— Няма зайкі, сьпіць недзе пад кустом і сьніць, што капустачку жымрыць... — кажа Югася. — Лепш ляжы і слухай...

Бабка некаторы час маўчыць, зьбіраецца з думкамі, а потым пачынае расказваць.

---

1. Каго чакала Ліза ўвечары? Куды паехалі бабка й дзед? Назаві мясцовасьць.
2. Чаму бабка Югася давала піць Лізе зёлкі?
3. Ці Ліза ахвотна піла зёлкі? Чаму гэтым разам згадзілася выпіць?
4. Пра каго яшчэ думала Ліза, і хацела пабачыць праз акно?

Слоўнічак:

Кульгавая — lame, crippled.
Шчуплы твар — thin face.
Ласка, пяшчота — kindness.
Кірмаш, торг — market.
Крутавеіца, завіруха — snowstorm.
Зёлкі — herbs.
Лекі — medicine.

II.

Жылі-былі два гаспадары, аднаго звалі Пятрусь — другога — Ясь. Жылі яны недалёка, адзін, скажам, у Тарэсіне, другі ў Пяшчынцы. Жылі дружна і хадзілі часта адзін да другога ў госьці. Прыйдзе Пятрусь да Яся на Каляды, пасадзіць гаспадар госьця на покуць, частуе пірагамі і мядовым крупнікам. Гасьцюе Пятрок тыдзень, другі, трэйці, аж пакуль сонца цераз кажух у плечы ня прыгрэе і саламяныя стрэхі з-пад сьнегу не пакажуцца. Тады толькі госьць пачне дамоў зьбірацца. Ясь яго за

вароты правядзе ды ўпрошвае яшчэ пагасьцяваць.

Гэтак-жа бывала, калі і Ясь прыходзіў да Пятруся. Прыйдзе вясной, на Міколу, зьбіраецца дамоў на Купалу, і то Пятрусь упрошвае застацца.

Аднойчы адзін прыяцель упікнуў другога: ”Ці ў мяне мулка спаць? Ці ў мяне мёд ня крэпкі? Чаго ты так рвешся дамоў?” – ”Дык і ты-ж у мяне ніколі доўга ня ўседзіш!” – адказвае другі. Слова за словам, чуць сябры не пасварыліся. На шчасьце, сварка скончылася тым, што яны далі слова гасьцяваць да таго часу, калі гаспадару больш не захочацца ўтрымліваць госьця...

Ліза слухала ўважліва, забылася яна ўжо і пра зайку, што бегае ў садзе, і пра дзеда з бабай, якіх так доўга няма з кірмашу. Ёй нават думаецца, што Пятрусь – гэта дзядзька Місюра, якога таксама так зваць, а Ясь – гэта Ясь Барысік, па мянушцы ”Папсуй”.

– Вось прыйшоў пасьля гэтага Пятрусь да Яся, – працягвае бабка. – Сядзяць яны, частуюцца. Праходзіць месяц, праходзяць два. Пачаў таяць сьнег, засьпявалі жаўрукі, пачарнела дарога, а госьць і ня думае зьбірацца дахаты. Прайшоў яшчэ тыдзень: забулькалі ручайкі, загулі пчолы, заклекаталі буслы, паказаліся пупышкі на дрэвах. Пачухаў Ясь патыліцу: неўзабаве пара будзе за саху брацца, а госьць сядзіць сабе ў хаце, п’е мёд ды песьні пяе. Гаспадар асьцярожна сказаў Пятрусю аб гэтым, і зноў спрэчка пачалася. ”Гоніш, значыцца, мяне, – кажа госьць, – а я не пайду дамоў, пакуль не пачую найлепшую на сьвеце песьню”.

Нічога не парадзіш, пайшоў Ясь шукаць сьпевакоў па ўсёй аколіцы. Прывядзе каторага, толькі той зацягне песьню, як госьць рукамі махае: ”Чуў, чалавеча, гэтую песьню, ня тая...” З ног зьбіўся гаспадар. Што рабіць?

Выганяць госьця? Не, не выпадае!

Выйшаў аднойчы госьць раніцай на ганак, пастаяў гэтак, паслухаў, потым увайшоў у хату, узяў шапку і падае руку гаспадару. "Ну, дзякуй, браце! Мне пара дамоў. Сёньня пачуў, як людзі найлепшую песьню сьпяваюць". – Што-ж гэта за песьня хаця?" – пытаецца Ясь, праводзячы госьця.

"Слухай!" – паказвае Пятрусь у поле, дзе зьявіліся першыя барозны і селянін паганяў каня: "Но, гняды! Но, варушыся!" – "Гэта і ёсьць найлепшая песьня!" – сказаў госьць і хуткім крокам пайшоў дахаты ...

Глухі трэск, нібы стрэл, пачуўся на двары.

Бабка прыслухалася і заківала галавой:

– Бач, як мароз страляе...

– Бабуня, а што далей было?

– А далей было вось што... – сказала Югася і стала ўзірацца ў вакно.

– Адсеяўшыся і ўхадзіўшыся з гаспадаркай, пайшоў Ясь да Пятруся ў госьці. Сядзіць тыдзень, сядзіць другі, п'е мёд і песьні пяе. Пятрусю пара ісьці ўжо касіць, а тут трэба з госьцем піць і "Зязюленьку" сьпяваць. Потым госьць кажа, што тады толькі дамоў пойдзе, калі найлепшую шапку пабачыць. Кінуўся Пятрусь сюды-туды, каб знайсьці найлепшую шапку. Ясь толькі галавой круціць: "Э, не-е-э, не такая!" Нарэшце прыйшло жніво, і госьць убачыў жытнія бабкі. "Ну, і мне пара! Убачыў найлепшую шапку", – паказаў ён на сноп, якім была накрытая бабка. Сабраў Ясь лахі пад пахі ды пайшоў дамоў.

---

1. Кім былі Ясь і Пятрусь? Ці яны былі добрыя прыяцелі? З чаго гэта відаць?
2. Перапішы сказы, якімі ў расказе апісаны прыход вясны.

3. Якую песьню Пятрусь уважаў за найпрыгажэйшую ў сьвеце? Аб чым гэта гаворыць?
4. У якім часе пайшоў Ясь у госьці да прыяцеля? Чаму цяпер?

Слоўнічак:

Гаспадар – farm owner.
Мулка (спаць) – цьвёрда
Не выпадае – It isn't right, proper.
Селянін – farmer.
Саха – wooden plow.

III.

Бабка Югася змоўкла. Маўчала і Ліза. Толькі завіруха, якая, здавалася, таксама пад акном слухала бабчыну казку, зноў сярдзіта завыла і застукала аканіцай.

– Бабуня, яшчэ адну, – пачала прасіць Ліза.

– Ну, яшчэ пра Юрку-пісара раскажу і – спаць... Юзік вунь на другі бок пераварочваецца... Ну, слухай...

Тут раптоўна пачуліся званочкі, і на надворак узьехалі сані.

– Прыехалі! Прыехалі! – усхапілася Ліза і ўткнулася носам у халодную шыбіну.

– Хавайся, Лізанька, пад коўдру і напалохаеш дзеда з бабай, – параіла Югася і пайшла адчыняць дзьверы.

Неўзабаве ў хату ўвайшла бабка і стала церці застылыя рукі. Адагрэўшыся, яна падыйшла да Лізінага ложка і папыталася ў Югасі:

– Сьпіць?

Югася нічога не адказала, і бабка павесіла вязку абаранкаў на біла, каля Лізінай падушкі.

Калі бабка адышла, Ліза працягнула руку да абаранкаў, ціхенька зьняла іх і пацягнула пад коўдру. Потым

яна чула, як увайшоў у хату дзед, скінуў бурку ды пачаў тупаць па кухні цяжкімі ботамі.

– Ціха, а то Лізачку пабудзіш, – супакойвала дзеда бабка.

– А хіба яна сьпіць? – запытаўся дзед. – Я-ж ёй гасьцінец прывёз...

І дзед з бабкай увайшлі ў бакоўку, дзе спала ўнучка.

– А-ё, а дзе-ж дзеліся абаранкі? – пляснула рукамі бабка. Я-ж іх тут вешала...

– Аку-ку! Аку-ку! – пачулася з-пад коўдры, а неўзабаве паказалася і ўскудлачаная галава дзяўчынкі.

– Ха-ха-ха! – сьмяяўся дзед. – Яна і ня думала яшчэ спаць, а бабка кажа: "Ня грукай, бо дзіця пабудзіш"...

– Гэта-ж я кажу, пара ўжо спаць, – пачала тлумачыць Югася, – а яна ні ў якую – бай байкі, пакуль з торгу ня прыедуць... Мусіла баяць...

– Што табе толькі ўсё байкі слухаць, – сказала бабка. – Ты цяпер, Лізанька, будзеш вучыцца з кніжкі. Дзед, дзе тая кніга, што мы сёньня купілі?

– А я і забыўся... Зараз, зараз, – усхапіўся стары і пайшоў на кухню, дзе вісела яго бурка. – На, унучка, вучыся, – працягнуў ён Лізе лемантар.

Дзяўчынка з радасьцю ўзяла кнігу і стала разглядаць малюнкі. Потым яна паклала лемантар пад падушку і заснула...

С. Александровіч

---

1. Па чым пазналі Ліза і нянька Югася, што прыехалі дзед і бабка?
2. Што прывезьлі бабка і дзед Лізе з кірмашу?
3. Якая пагода была ў той вечар? Перапішэце з расказу словы, якія гавораць аб пагодзе.

АПОШНІ ДЗЕНЬ У ШКОЛЕ

Апошні дзень у школе! Сяньня ўсе яшчэ сядзяць у сваіх лаўках, але ўжо заўтра пачынаюцца запраўдныя вакацыі.

Настаўніца толькі што раздала пасьветчаньні. Яны ляжаць цяпер на лаўках. Ужо можна было-б разьвітацца і пайсьці дахаты, але неяк ніхто не сьпяшаецца.

– Такі сяньня прыемны дзень, – кажа Юльянка.

– Ну, пэўна! – згаджаецца Валодзя. – Гэта-ж заўтра вакацыі.

– Але ня толькі таму, – кажа Юльянка. – Сяньня канчаецца навучальны год. Усе мы атрымалі добрыя пасьветчаньні. А помніце, як мы яшчэ нядаўна баяліся канца навукі і пасьветчаньняў?

– Лявон хварэў, і мы думалі, што ён ня здасьць у трэйцюю клясу.

– У мяне таксама была двойка з арытмэтыкі.

– За першае паўгодзьдзе ў шмат якіх дзяцей былі кепскія адзнакі.

– Але мы добра ўзяліся за навуку.

– Мы памагалі слабейшым.

– А цяпер усе перайшлі ў трэйцюю клясу. Ніхто не застаўся на другі год. І таму запраўды вельмі прыемна, – кажа Юльянка. – Праўда? – зварачаецца яна да настаўніцы.


– Але, Юльянка, – кажа настаўніца. – Сяньня радасны дзень для ўсяе клясы. Наша супольная праца дала добрыя вынікі. Мы выканалі сваё заданьне. І таму адпачынак будзе яшчэ больш прыемным. Вы заслужылі на вясёлыя і бесклапотныя вакацыі.

А праз два месяцы сустрэнемся ў трэйцяй клясе.

– I адразу возьмемся добра за навуку, – абяцаюць дзеці. – Каб ад пачатку году мецць такія самыя радасныя дні, як сяньня!

ВАКАЦЫІ

Палі, бары паклікалі –
сьпявае дзетвара:
"Вакацыі, вакацыі –
вясёлая пара!"



Расстанемся са школаю
Мы не на доўгі час,
Бо лягеры вясёлыя
Даўно чакаюць нас.

Там будзем днём пагодлівым
Купацца, загараць,
З палеткаў краю роднага
Гэрбарыі зьбіраць.



Каб з новымі навінамі
Сустрэць вучэбны год,
Лугамі і далінамі
Мы пойдзем у паход.

І радасна, і дружна мы
Час летні правядзём,
Бадзёрымі і дужымі
У школу зноў прыйдзём.

Палі, бары паклікалі –
Сьпявае дзетвара:
"Вакацыі, вакацыі –
Цудоўная пара!"

А. Ставер

МЫ ВЫЙДЗЕМ ШЧЫЛЬНЫМІ РАДАМІ

(Беларускі нацыянальны гімн)

Мы выйдзем шчыльнымі радамі
На вольны, родны свой прастор,
Хай воля вечна будзе з намі,
А гвалту мы дамо адпор.

Няхай жыве магутны, сьмелы
Наш беларускі родны дух,
Штандар наш бел-чырвона-белы
Пакрыў сабой народны рух.

На бой за шчасьце і за волю
Народу слаўнага свайго!
Браты, цярпелі мы даволі,
На бой мы ўсе да аднаго.

Браты! да шчасьця мы падходзім,
Хай гром грыміць яшчэ мацней.
У крывавых муках мы адродзім
Жыцьцё Рэспублікі сваей.

Словы М. Краўцова

(Музыку да нашага гімну напісаў У. Тэраўскі)

МАГУТНЫ БОЖА...

(Беларускі рэлігійны гімн)

Магутны Божа, Уладар сусьветаў,
Вялікіх сонцаў і сэрц малых!
Над Беларусяй ціхай і ветлай
Рассып праменьні Свае хвалы.

Дай спор у працы штодзённай шэрай,
На лусту хлеба, на родны край,
Павагу, сілу і веліч веры
У нашу праўду, у прышласьць — дай!

Дай урадлівасьць жытнёвым нівам,
Учынкам нашым пашлі ўмалот,
Зрабі магутнай, зрабі шчасьлівай
Краіну нашу і наш народ!

Словы Натальлі Арсеньневай.

ЗЬМЕСТ:

Зьмена (верш), *Іван Шуцько* ... 1
Жывы куток ... 1
У бібліятэцы ... 2
Сваім розумам ... 3
Падказка (верш), *Віктар Швед* ... 3
Ветлівасьць ... 4
Два таварышы, *Л. Талстой* ... 4
Добрая парада ... 5
Умей пачакаць *(казка)* ... 6
Надыход зімы ... 7
Сьнег ... 8
Дзяўчынка і сьняжынка (верш), *Віктар Швед* ... 8
На лыжах (верш) ... 9
Дзень і ноч ... 10
На канькох (верш) ... 10
Хто як зіму сустракае ... 10
Мароз (верш) ... 11
Птушкі зімою ... 12
Верабейчык (верш) ... 12
Загадка (верш), *Іван Шуцько* ... 13
Дзіўны мастак (верш), *Віктар Швед* ... 13
Поры году ... 14
Месяцы ... 14
Дванаццаць птушак ... 15
Лясныя дактары (верш), *Віктар Швед* ... 16
Казка пра лісу ... 16
Чаму? ... 17
Сыны ... 18
Добрая работа ... 19
Лялечны тэатр ... 20
Працавітая дачушка (верш), *Віктар Швед* ... 21
Далёка да сонца (верш), *Віктар Швед* ... 22
Па сяброўску ... 23
Вучыся (верш), *Пятро Глебка* ... 23
Як людзі навучыліся есьці бульбу ... 24
Селянін і мядзьведзь ... 25

Мая сям'я (верш), *Васіль Вітка* 26
Асушэньне балота 27
Зіма набліжаецца 27
Лістапад (верш), *Янка Купала* 29
Апал на зіму 29
Сінія лісточкі 31
Дзе Антося? 32
Вяснушкі (верш), *Віктар Швед* 33
Першы радыёпрыём 34
Пяцёра ў вадным стручку 35
Мілы гном, дзе твой дом? (верш), *Віктар Швед* 40
Справядлівае разьмеркаваньне працы 41
Пілнавала Гануля малако ў каструлі (верш), *Віктар Швед* ... 43
Два марозы, *(з народнага)* 43
Ёлка (верш) 45
Любіш катацца – любі саначкі вазіць, (верш), *Іван Шуцько* 46
Менск 46
Менск (верш), *Пятро Глебка* 48
Малыя чыгуначнікі 48
Цягнік 50
Новы дом (верш), *Іван Шуцько* 52
Якраз таму 52
Зіме канец 53
Коцікі вярбовыя (верш), *Віктар Швед* 54
Абутковая фабрыка 55
На ткацкай фабрыцы 56
Карысная жывёла 57
Санітар *(апавяданьне жаўнера)* 58
Пажарныя сабакі, *Л. Талстой* 60
Навука і каток (верш), *Віктар Швед* 61
Вожык 62
Вожык і кот (верш), *А. Жаўрук і А. Ушакоў* 63
Ваўкі 64
Мядзьведзіца 65
Леў і сабачка, *Л. Талстой* 66
Певень (верш), *Якуб Колас* 67
Балотная вада 68
Курка Чубатка і гусяняткі (верш), *Віктар Швед* 70

Кім быць? (верш), *Іван Шуцько* 71
Едзем да цёткі 71
Надакучыла зіма (верш), *Якуб Колас* 77
Дні ўсё большаюць 77
Песьня аб вясьне (верш), *Якуб Колас* 78
Гракі прыляцелі 79
Лес і ручай 80
Веснавая прагулка (верш) 81
Вартаўнікі саду 82
Вераб'ёвы госьці (верш), *з народнага* 83
Наш агарод 84
Гародніна (верш), *Юльян Тувім* 84
Наш вялікі паэт – Янка Купала *(дзіцячыя і юнацкія гады)* 85
Вучыся! (верш), *Янка Купала* 87
Роднае слова (з жыцьця Янкі Купалы), *Васіль Вітка* 88
Воля (верш), *Янка Купала* 89
Бацькаў гасьцінец (з дзяцінства Я. Коласа), *С. Александровіч* 89
Лета (верш), *Якуб Колас* 92
Журавель (верш), *П. Варанько* 92
Лета 92
У грыбох (верш), *А. Ставер* 94
Звоніць поле (верш), *Янка Купала* 95
Ягады (верш), *Пятро Глебка* 95
Цікавая лекцыя 96
Альфабэт (верш), *Юльян Тувім* 97
Расказы пра школьную торбу 98
Зубры ў Белавескай Пушчы 103
Кот і лісіца *(народная казка)* 104
Страшны зьвер (верш) 107
Чараўнічыя словы 108
Скарб бабкі Галены 112
Гэй, наперад! (верш), *Янка Купала* 113
Які гэта памочнік? 113
Пстрык (верш), *Юльян Тувім* 114
Казкі бабкі Югасі (з дзяцінства паэткі Цёткі – А. Пашкевіч), *С. Александровіч* 115

Апошні дзень у школе 122
Вакацыі (верш), *А. Ставер* 123
Мы выйдзем шчыльнымі радамі,
Беларускі нацыянальны гімн 124
Магутны Божа... *Беларускі рэлігійны гімн* 125